Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 03 (2801) Год LV | Беласток, 17 студзеня 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

Размова з Анатолем Вапам, дырэктарам дэпартамента культуры і нацыянальнай спадчыны Маршалкоўскай управы Падляшскага ваяводства

Беларусам крыху больш

„Ніва”: ***— Колькі грошай і на колькі праектаў у цяперашнім траншы прызначыла Маршалкоўская ўправа ў галіне культуры і нацыянальнай спадчыны, у тым ліку на рэалізаваныя арганізацыямі беларускай меншасці?***

Анатоль Вап: — 29 снежня 2009 года праўленне ваяводства размеркавала першыя датацыі на 2010 год. Другі транш будзе падзелены ў красавіку на заданні рэалізаваныя ў тэрміне ад ліпеня да снежня. Цяпер размеркавалі мы больш-менш дзве траціны грошай. Агульна пададзена было 376 заяў, з якіх 55 не выконвала патрабаванняў, значыць, ацэнцы падлягаў 321 праект. Пасля фармальнай ацэнкі, якую зрабіў наш дэпартамент і разгляду праведзенага спецыяльнай камісіяй, датацыі атрымалі 183 праекты, на агульную суму 1 мільёна 270 тысяч злотых. Падобна як у мінулыя гады, гэтыя праекты ацаняліся ў рамках дванаццаці прыярытэтаў, між іншым, прыярытэта: падтрымка культурных ініцыятыў нацыянальных і этнічных меншасцей, пражываючых на тэрыторыі Падляшскага ваяводства. Прапановы падалі амаль усе нашы меншасці, апрача расіян, значыць — беларусы, літоўцы, украінцы, татары і ромы. Беларуская меншасць атрымала агулам амаль 200 тысяч зл., і гэта крыху больш чым у мінулым годзе. Мы рашылі дафінансаваць амаль сорак праектаў розных беларускіх арганізацый.

— Якія з беларускіх арганізацый атрымалі найбольш грошай на свае праекты?

— Ёсць некалькі такіх вылучаючыхся арганізацый, між іншым Звяз беларускай моладзі, Беларускае грамадска-культурнае таварыства, Згуртаванне „АБ-БА”, Таварыства беларускай культуры, Беларускае асветнае таварыства, Беларускае гістарычнае таварыства. Атрымалі яны па некалькі датацый.

— Адносна шмат грошай, бо аж 40 тыс. зл., назначылі вы Звязу беларускай моладзі на рэалізацыю чарговага праекта „Падляшскі культурны шлях — Дрэва і сакрум”. Што ў ім такое каштоўнае, што варта інвеставаць у гэта адносна вялікія грошы?

— Гэты праект упісваецца ў шырэйшыя дзеянні ўлад Падляшскага ваяводства, якія маюць на мэце ахову драўлянага будаўніцтва. У такім шырокім маштабе захавалася яно

выключна на Падляшшы. Ёсць у нас цэлыя вёскі, цэлыя гміны, а нават цэлыя паветы, якія ў значнай частцы маюць яшчэ старадаўнюю драўляную забудову і несумненна трэба яе захоўваць. І вось адной з такіх форм аховы з’яўляецца „Падляшскі культурны шлях”. Цяпер гэта ўжо трэці этап гэтага праекта, рэалізаванага ЗБМ, ахопліваючы Бельскі і Гайнаўскі паветы і паўднёвую частку Беластоцкага павета, уваходзіць на тэрыторыю Заблудаўскай гміны. Гэты шлях з’яўляецца кампактнай цэласцю, свайго роду пятлёй. У будучыні намерваемся пашырыць гэты праект на рэшту паўднёвай часткі ваяводства і паўночную яго частку.

— У спіску назначаных цяпер датацый стаіць запіс аб фінансавым падмацаванні Падляшскага музея ў Беластоку ў яго праекце стварэння калекцыі прац мастакоў з беларускай меншасці ў Польшчы. Што гэта за калекцыя?

— У прынцыпе гэтыя грошы прызначылі мы аддзелу Падляшскага музея ў Бельску-Падляшскім. Не стварыў ён дагэтуль нейкай асобнай, манаграфічнай калекцыі. Маюць весціся закупкі туды ў першую чаргу твораў жывых і сучасна ствараючых мастакоў беларускай нацыянальнасці, такіх як Маргарыта Дмітрук, Віктар Кабац ці Анатоль Краўчук. Гэта незвычайна цікавы праект так на думку камісіі, як і ваяводскай управы.

— Сёлета адзначаецца 600-годдзе Грунвальдскай бітвы. Якія праекты звязаныя з гэтай падзеяй будуць падтрыманы Маршалкоўскай управай і ці дойдзе да прадбачванай „грунвальдскай” інсцэніроўкі ў падбеластоцкім Музеі вёскі?

— Увесь час працуем над інсцэніроўкай канцэнтрацыі войск Вялікага Княства Літоўскага, якая фактычна адбылася на тэрыторыі нашага ваяводства ў 1410 годзе. У сувязі з гадавінай бітвы да таго пададзены былі яшчэ чатыры заявы. На дзве з іх, якія маюць быць рэалізаваныя ў Пунску і ў Беластоку, размеркавалі мы 10 тыс. зл. Прапанова з Белавежскай гміны на „паляванне караля Ягайлы” не вытрымлівала фармальных патрабаванняў. Таксама прапанова, якая прыйшла з Сейнаў, не была пазітыўна ацэнена. Не значыць гэта, што мы не назначым датацый на іншыя мерапрыемствы звязаныя з гадавінай Грунвальдскай бітвы. Паўтараю, у красавіку будзем яшчэ разглядаць заявы і тады таксама Белавежа і Сейны змогуць іх яшчэ раз падаць пасля іх дапаўнення. Цяпер прызначылі мы грошы для Дзіцячага садка № 14 у Беластоку, які рыхтуе мерапрыемства „Грунвальд вачыма дашкольніка”, а таксама для Дома літоўскай культуры ў Пунску, які будзе ствараць абоз Вялікага Княства Літоўскага, што стане потым часткай гэтай вялікай канцэнтрацыі войск.

— А якія шанцы ўдзелу ў гэтай вялікай канцэнтрацыі войск літоўскага і беларускага бакоў?

— Пераходзім ужо да канкрэтных размоў і са згуртаваннямі, і ўстановамі такімі як Культурны цэнтр Беларусі ў Беластоку. Накіравалі мы ў гэтай справе лісты губернатарам Брэсцкай і Гродзенскай абласцей. Былі мы таксама на сустрэчы ў гэтай справе ў Міністэрстве культуры Літвы, дзе размаўлялі з літоўскім віцэ-міністрам, і сустрэліся з дырэктарам Гістарычнага музея ў Троках, які будзе падтрымліваць гэтую ініцыятыву.

— Дзякуем за размову.

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Свіслач • Гародня • Ваўкавыск • Шчучын • Гайнаўка • Высокае • Масты • Беласток • Бельск-Падляшскі • Сямятычы

98,1 FM

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ

www.racyja.com

Газавае надвор’е ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

Тады Сібір’ю палохалі не толькі зіму, але і ўсіх, каму давялося жыць у краіне нядобрых зім ды вёснаў. Ды не толькі палохалі. Але і свае запалохванні стараліся спрактыкаваць на жывых людзях. І ні мокрая восень, ні засушлівае лета гэтаму, у адрозненні ад сельскай гаспадаркі, аніяк не маглі перашкодзіць...

Пасля пяці гадоў у Еўрасаюзе ☞ 4

Міхал МІНЦЭВІЧ

Што з малаком? ☞ 5

Аляксей МАРОЗ

Пасля З’езда ☞ 11

Віктар БУРА

Газавае надвор'е

Калісьці вялікі адэскі гумарыст Міхаіл Жванецкі, слухаючы адказных за сельскую гаспадарку савецкіх чыноўнікаў, прыйшоў да нязвыклай для іншых людзей высновы, якая тлумачыла чаму савецкая сельская гаспадарка не магла накарміць грамадзян краіны рабочых і сялян.

— Нашай сельскай гаспадарцы, — патлумачыў тады Жванецкі, — перашкаджаюць усяго чатыры фактары. Гэтыя фактары — зіма, вясна, лета і восень.

Адразу ўсім стала зразумела, што каб не было зімы, вясны, лета і восені, то краіна саветаў змагла б пракарміць сябе сама. А так прыходзілася прадаваць нафту, каб купіць у Канадзе зерне. Тыя нафтавыя і газавыя трубы кармілі тады цэлую шостую частку сушы. Ну не саму сушу, а грамадства, што складалася з больш за сто нацыянальнасцей, і якія на той сушы мелі шчасце, ці няшчасце, несці свой, прадвызначаны вялікім лёсам, крыж.

Сапраўды, калі, прыкладам, лета дажджлівае, то зерне ў СССР вымакала. Ну а калі лета выдавалася сонечнае, то зерне высыхала. З іншымі порамі года было нешта падобнае. Вясна ніколі не была нармальнай. Або зарана прыходзіла, або запозна. А калі прыходзіла не рана і не позна, то чамусьці не да нас. Восень зусім была гадкая. Перашкаджала працаваць і людзям, і тэхніцы. То зашмат балота было, то замала школьнікаў ды студэнтаў, якія прыязджалі распачынаць лютую вайну за ўраджай. Ну а пра зіму і казаць не хочацца. Яе тады заўсёды называлі сібірскай, нават у чарназёмнай палосе, адкуль да сапраўднай Сібіры далей чым да цёплага Гібралтарскага праліва.

Тады Сібір'ю палохалі не толькі зіму, але і ўсіх, каму давялося жыць у краіне нядобрых зім ды вёснаў. Ды не толькі палохалі. Але і свае запалохванні стараліся спрактыкаваць на жывых людзях. І ні мокрая восень, ні засушлівае лета гэтаму, у адрозненні ад сельскай гаспадаркі, аніяк не маглі перашкодзіць.

Таксама нядобрага надвор'я не баяліся і трубы. Ні газавыя, ні нафтавыя. Таму, хіба, што былі закапаны глыбока пад зямлю, куды так і не дайшлі ідэі калектывізацыі, кіруючай ролі камуністычнай партыі і нянавісці да капіталістычных краін, якім зіма, вясна, лета і восень дапамагалі збіраць добрыя ўраджаі.

Тыя трубы і зараз там ляжаць. Праўда, кормяць яны ўжо не насельніцтва шостай часткі сушы, а невялікае элітнае кола асоб, якія, ведаючы пра нядобрыя зімы і вёсны, вырашылі не звяртаць увагі на сельскую гаспадарку, а сканцэнтраваць сваю ўвагу менавіта на энерганосьбітах. І тут, некалі кепская зіма адразу стала для іх добрай хаўрусніцай.

І як толькі мароз узмацняецца, дык адразу нібыта ўзмацняецца канфлікт паміж Расіяй і Беларуссю. Усё з-за гэтых труб, якія самі па сабе марозу не баяцца. А ўся фішка ў тым, што Беларусь нібыта не заплаціла Расіі за нафту і газ, таму Расія можа спыніць пастаўкі гэтых прадуктаў у Беларусь. Адпаведна, яны не трапяць і ў Еўропу, бо праз Беларусь туды пастаўляюцца.

Беларусь у сваю чаргу робіць выгляд, што пакарае рускіх за такое свавольства, і падыме транзітныя пошліны, што адпаведна падыме кошт на энерганосьбіты. І вінаватых няма, бо абодва бакі нібыта маюць рацыю.

А кошты падымаюцца. Так падымаюцца, ажно біржы трасе ў страшнай ліхаманцы. Нафта ды газ, у перыяд іх самага вялікага спажывання, даражэюць. Расійскія і беларускія ўладальнікі труб атрымліваюць звышпрыбыткі, а Еўропа лічыць, што беларусы з рускімі пасварыліся і, стараючыся залагодзіць канфлікт краіны ўладальніцы нафты і газу ды краіны транзіту гэтых прадуктаў, разглядае мажлівасць абдарыць іх новымі крэдытамі.

А ўладальнікі труб, яны ж нелюбіцелі аніякай пары года, толькі паціраюць рукі і далей працягваюць гульні ў агульную мытную прастору, уцягваючы туды Казахстан ды адабраныя ад Грузіі тэрыторыі, каб можна было дзякуючы гэтым транзітным тэрыторыям толькі ім кантраляваць тэмпературу ў кватэрах усёй Еўропы.

Такім чынам Сібір можна зрабіць у Еўропе ў кожную зіму. Стане гэта горш для еўрапейцаў, ці лепш, пакажа час. Бо губляючы ў адным, нешта набываецца ў іншым. І калі Еўропе бракуе мазгоў, каб зразумець, што яе так кожную зіму будуць шантажаваць і палохаць, калі яна будзе праводзіць палітыку загульванняў і залагоджванняў, якую праводзіць зараз, то будзе мець хутка крэпкае сібірскае здароўе.

Віктар САЗОНАЎ

У Мінску згадалі Алега Лойку

На філалагічным факультэце Белдзяржуніверсітэта ў Мінску адбылася канферэнцыя, прысвечаная памяці доктара філалагічных навук, прафесара, член-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Алега Лойкі.

У ёй прынялі ўдзел пісьменнікі, навукоўцы, былыя і сённяшнія студэнты-філолагі з многіх гарадоў Беларусі.

Канферэнцыю адкрыла доктар філалагічных навук, прафесар Таццяна Шамякіна, якая адзначыла заслугі Алега Антонавіча ў гісторыі нашай навукі, літаратуры, педагогікі і культуры, падкрэсліўшы пры гэтым, што Алег Лойка заўсёды быў генератарам цікавых ідэй на ніве беларускай філалогіі і навукі.

Доктар філалагічных навук, прафесар Вячаслаў Рагойша, які вёў канферэнцыю, сказаў, што Алег Лойка быў чалавекам незвычайным, а тое, што ён зрабіў у літаратуразнаўстве, варта самай вялікай пахвалы. „Ён напісаў гісторыю беларускай літаратуры ад старажытнасці да пачатку XX стагоддзя. Тое, што па сутнасці робяць цэлыя інстытуты, ён зрабіў адзін. Я, напрыклад, не ведаю ў рускай літаратуры такога чалавека, які б адзін напісаў гісторыю літаратуры ад старажытнасці да нашых дзён. У нас такі чалавек быў. Гэта Алег Лойка. Ён першы і адзіны пакуль беларус, які выдаў у Маскве ў серыі ЖЗЛ [Жизнь замечательных людей — рэд.] кнігі пра Францыска Скарыну і Янку Купалу".

„Алега Лойку як паэта я ўпершыню пачуў ажно ў 1943 годзе. Яму тады было толькі 12 гадоў. Ён друкаваўся ў „Баранавіцкай газеце". Мы разам некалі паступалі з ім на філалагічны факультэт БДУ. І з таго часу ўсё жыццё шчыра сябравалі", — прыгадаў пісьменнік Уладзімір Дамашэвіч.

Прафесар Міхась Мушынскі ў сваім выступленні падкрэсліў наступнае: „Алег Лойка вельмі моцна перажываў катаклізмы грамадскага, псіхалагічнага і палітычнага характару, якія напаткалі нас на пачатку XXI стагоддзя. Ён таксама адчуваў і сваю адказнасць за лёс нашай краіны, літаратуры і культуры. Гэта вельмі моцна ўздзейнічала на яго фізічны стан і на яго псіхалагічнае адчуванне. Алег Лойка быў маім сябрам таксама шмат гадоў. Ён з'яўляўся маім апанентам па абароне кандыдацкай і доктарскай дысертацый".

Пісьменнік, кандыдат філалагічных навук Янка Саламевіч расказаў пра тое, як ён стаў філолагам, дзякуючы Алегу Лойку. А таксама шчыра прыгадаў пра свайго земляка: „Алег Лойка мне больш за іншых дапамагаў. Спрабаваў вучыць пісаць рэцэнзіі, хоць іх не друкавалі. Дапамагаў разбірацца ў літаратуры. Як аспірантам, мною афіцыйна кіраваў загадчык кафедры беларускай літаратуры філфака БДУ Міхась Рыгоравіч Ларчанка. Але трэба ўжо нарэшце прызнацца, што ён нават не прачытаў маёй работы. Алег жа чытаў, правіў, крэсліў, падказваў, што і як лепш рабіць, як пісаць навуковую працу. Калі на абароне ў траўні 1971 года я сказаў у заключным слове, што ў мяне было два кіраўнікі — Міхась Ларчанка і Алег Лойка, Ларчанка нават пакрыўдзіўся, бо круціў носам. На банкет, праўда, прыйшоў.

Бацька Алега Лойкі, Антон Цімафеевіч, быў вельмі задаволены, што мы з Алегам сябруем. Алегава маці, Марыя Іванаўна, была маёй матулькаю-хроснаю, трымала мяне малога ў Альбярціне да хрэсту. Бацькі былі бедныя, поп і ксёндз бралі за хрышчэнне болей, дык яны, толькі каб дзіця было ахрышчана, аддалі мяне — малечу ў рукі ўніяту. У мяне ёсць метрыка майго хрышчэння ў Альбярціне, падпісаная самім Антонам Неманцэвічам.

Колькі мы, калі я жыў блізка ад Алега, на вуліцы Янкі Маўра ў Мінску, перагаварылі, гуляючы кожны вечар па дарожцы ў дварах. Я даў нават назву аднаму з яго зборнікаў вершаў „Дзівасіл". У мяне ўсе яго кнігі з аўтографамі. А гэта ні мала ні многа — 101! Калі я выдаў манаграфію пра Міхала Федароўскага, падпісаў яе цётцы Надзі, старэйшай бацькавай сястры, у чыёй хаце на Цагельнай вуліцы ў Слоніме яе напісаў, падпісаў матульцы, якая сказала, што гэта пасля Алегавых кніг для яе самы дарагі падарунак, Алегу і Лілі, натуральна, былі падпісаны самыя першыя экземпляры. Так што Алег Лойка — быў і застаецца самым дарагім, самым сардэчным, самым разумным, шчырым, самым вялікім сябрам. Яго я любіў больш за ўсіх на свеце! Ён быў маім настаўнікам, маім аднадумцам, кумірам, маім вечным захапленнем!"

Сяргей ЧЫГРЫН

Вачыма еўрапейца

Кот для талерантнасці

У дзяцінстве мама мне часта спявала сатырычную песню аднаго з польскіх кабарэ, здаецца, Студэнцкага тэатра сатырыкаў, падагульненне якой мела філасофскі характар. Гаварылася ў ёй аб казачнай Чырвонай шапачцы (вядома, з падаплёкамі). Кончылася больш-менш так: „ніколі не вядома, хто хаваецца пад чырвонай шапачкай". Прыгадалася мне яна тады, калі я пераглядаў спісак мерапрыемстваў у галіне культуры і аховы нацыянальнай спадчыны, якія будуць дафінансоўвацца Маршалкоўскай управай у першай палове гэтага года. Уступную інфармацыю на гэтую тэму разаслаў па рэдакцыях прэс-сакратар падляшскага маршалка Ян Квасоўскі. Напісаў ён, абгрунтоўваючы выбар праектаў, м.інш.: „Ёсць сярод іх культурныя праекты высокага мастацкага рангу, прамоцыя літаратурнай творчасці, выданні па гісторыі і культуры рэгіёна. Сфінансаваныя будуць таксама закупкі музейных калекцый, адукацыйныя мерапрыемствы для дзяцей і моладзі, таксама развіваючыя самадзейнасць. Адобраны былі таксама шматлікія праекты дбаючыя аб культуру нацыянальных і этнічных меншасцей". Аб гэтым апошнім на першай старонцы гэтага нумара „Нівы" распавядае дырэктар дэпартамента культуры і нацыянальнай спадчыны Маршалкоўскай управы Падляшскага ваводства Анатоль Вап.

Ва ўзгаданым пераліку фінансаваных праектаў знайшоў я шмат цікавых планаваных мерапрыемстваў. Аднак аж вочы пралупіў ад уражання, калі двойчы натрапіў на праект пад лозунгам „Кот для талерантнасці". У першым выпадку з падтрымкай 6,5 тыс. зл. Беластоцкі асяродак культуры сарганізуе цыкл майстар-класаў на тэму шматкультурнасці, у другім сумай 5 тыс. зл. маюць быць „падтрыманы настаўнікі і адукатары ў сферы падрыхтоўкі дзяцей і моладзі да шматкультурнасці" ў рамках дзеянняў Фонду Універсітэта ў Беластоку „Universitatis Bialostocensis". У чым справа? — падумаў я. Шматкультурнасць, талерантнасць і... кот? Пры чым тут гэтае стварэнне? Можа, гаворка пра талерантнасць у адносінах да катоў? Ды пры чым тут шматкультурнасць? Зайшоў я тады да адной з працаўніц дэпартамента культуры Маршалкоўскай управы, якая ведае дэталі таго „Ката для талерантнасці". Растлумачыла яна мне, што гэта адзін з лозунгаў шматгадовага праекта пад працоўным загалоўкам „Жывём разам", які будзе рэалізавацца ў дванаццаці падляшскіх мясцовасцях (між іншым у Бельску-Падляшскім, Гайнаўцы, Крынках, Сямятычах і Саколцы). У пісьмовай версіі гэтага праекта я прачытаў, што яго мэта — „перш за ўсё шырока разуметая адукацыя, якая мае ўсвядоміць жыхарам Падляшскага ваяводства, як і іншых рэгіёнаў Польшчы, што дзякуючы дыялогу паміж людзьмі розных канфесій, нацыянальнасцей ды рас, розных поглядаў, людзьмі беднымі і багатымі, здаровымі і нямоглымі, гома- і гетэра-, людзьмі з горада і з вёскі магчымым з'яўляецца бесканфліктнае сужыццё гэтых разнародных груп". Далей высакапарна заяўляецца: „Кожны з нас — іншы, але жывём мы на гэтай зямлі, пад адным небам і павінны шанаваць адзін аднаго".

Адкуль, аднак, у гэтым меху шматлікасці, іншасці ды разнароднасці той кот?

Аказалася, што ў рамках аднаго з майстар-класаў дзеці-ўдзельнікі праграмы „Жывём разам" маюць працаваць над п'есай аднаго з іспанскіх аўтараў „Казка пра ката Колера", якая гаворыць пра ката іншага ад астатніх катоў, але з-за гэтага не горшага. І тады ў мяне ў галаве мільганула думка! Фактычна — падумаў я якраз тады — не заўсёды можна быць упэўненым, што схавана пад чырвонай шапачкай! Таму, хто прыдумаў праект „Жывём разам", жадаю поспехаў!

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Фота Мікалая Казака

Аўтарка ў шасцідзесятыя гады

Шчадруха

Алена АНІШЭЎСКАЯ

Платы амаль па верхні пояс стаялі ў пушыстым снезе. Мяккія пярыны ляжалі на стрэхах хат. Сёлетняя зіма не скупілася: шчодра прымарожвала ды пасыпвала белым пухам.

Вечарэла. Непрыкметна, нібы крадучыся, надыходзіў зімовы вечар.

Заскрыпелі шырокія дзверы старой хаты, і на падворак не столькі выйшла, а хутчэй за ўсё выкацілася цётка Тэкля. Яна надта ж баялася прастуды, апраналася ў безліч кофтаў, душагрэек, сардакоў і прыкрывала ўсё гэта старым, моцна паношаным кажухам. Выглядала яна як тоўсты куль саломы. Сёння ж паверх на ўсё накінула прыгожую ваўняную хустку. Вядома, незвычайны той вечар — паводле даўнішняга звычаю яго завуць шчадрухай.

Тэкля ад вайны стала ўдавою. Дзяцей у яе не было, а сядзець адной у хаце, асабліва ў такі вечар, яна не любіла. Дзверы замкнула доўгім драўляным ключом, якім ужо на памяць трапляла ў дзірку вушака. Адняла ад прызбы абмёрзлую мятлу і паклала на тое месца ключ, нагарнула на яго снегу, а мятлу схавала за хату. Падумала: „Сёння трэба зважаць на ўсялякія хлапцоўскія свавольствы!" Вось у мінулым годзе прывалаклі ў вароты ёй куль саломы, застрыкнулі мятлу, а зверху, нібы капелюшом, прыкрылі вядром, знятым з коварата. Яшчэ і непрыемнасць з гэтага выйшла: Рыгор прыйшоў на Новы год забіраць тую салому, бо быццам з яго клуні яе выцягнулі, а і ёй самой гэты куль прыдаўся б. Пачалі яны сварыцца, а людзі кажуць: „Пасварышся ў такі дзень — то ўвесь год будзеш грызціся з суседзямі". І яна, каб не смяшыць людзей, уступіла.

Закруціла Тэкля вароты дротам, нагарнула снегу на сцежку і выйшла на вуліцу. Стала на сярэдзіне і разважала, куды тут падацца. У яе на прыкмеце было некалькі хат, дзе можна прыемна правесці вечар.

„Можа пайсці да Ёзікавых? Каця смачную каўбасу робіць, пачастуе. Ну, крыху задалёка. Можа да Буславых? Ой, не, скупаватыя. Да суседзяў праз вуліцу блізка. Але не пайду, бо ён любіць усё насміхацца — сапсуе вечар. Не заўсёды даю рады адгрызціся".

Падняла Тэкля ўверх галаву і паглядзела, дзе дым з коміна выходзіць. Амаль з усіх каміноў дымілася. Гаспадыні рыхтавалі святочную вячэру. То ж гэта шчодры, багаты вечар! Усе стараюцца, каб сёння вячэра была раскошнай.

З коміна хаты, дзе жыла яе сяброўка Ніна, таксама ўдава, тонкай стужачкай струменіўся дымок. „Пайду да яе, — падумала Тэкля, — яна не скупая. Да таго, напэўна, збяруцца туды дзяўчаты варажыць — будзе весела". На ганку яна абтопала ногі, адчыніла скрыпучыя дзверы ў сені і пачула звонкія дзявочыя галасы. Увайшла ў кухню. Там прыемна запахцела. „Вось і добра трапіла", — падумалася Тэклі.

— Зачыняйце дзверы хутчэй! — закрычалі дзяўчаты. — Мы тут сёння будзем доўга варажыць, няхай цяпло не ўцякае.

— Варажыце, дзяўчаткі, варажыце сабе, — супакоіла іх Тэкля. — Мо і я што-небудзь падкажу. Ой, калісьці, бывала, мы варажылі...

Глянула яна на стол: там ляжалі роўненька нарэзаныя паперкі і некалькі алоўкаў.

— То і пісаць штосьці трэба? Што гэта за такая варажба? Мы калісьці гэтага не ведалі, бо і пісаць не ўсе ўмелі.

— А такая варажба, — азвалася прыгожая бялявенькая Каця. — На гэтых паперках напішам імёны хлопцаў. Кожная жменьку гэтых білетаў пакладзе сабе пад падушку нанач, а раніцай выцягне адзін і прачытае тое імя, як будзе называцца яе муж.

— А калі не выйдзе замуж? Можа не суджана ёй пара? — зацікавілася Тэкля.

— Тады выцягне пусты білет. Бачыце, усё абдумана ў гэтай варажбе.

— А яшчэ якую ведаеце варажбу?

— Я ім зараз падкажу варажбу, — сказала Ніна.

Падышла яна да пліты і доўгай драўлянай лыжкай дакладна вымешала куццю, адставіла гаршчок на край пліты, а на яго месца паставіла патэльню з нарэзанай саланінай.

— Бярыце па лыжцы куцці і па чарзе выходзьце на падворак. Ідзіце на тое месца, дзе мы парсючка смалілі. Трэба памаленьку есці куццю і слухаць, дзе, з якога боку сабака забрэша. У той бок, значыць, замуж пойдзеш. Гэта вельмі праўдзівая варажба. Мне калісьці заўсёды вельмі далёка сабакі брахалі, ды ўсё ў кірунку Белавежскай пушчы. Ну, сюды, бачыце, і прыйшла я. А маім сяброўкам брахалі блізка, і яны павыходзілі ў сваім сяле.

Дзяўчаты пачалі згаворвацца, якая пойдзе першая.

— Няхай уперад ідзе найстарэйшая, — параіла гаспадыня і, зачарпнуўшы лыжку кашы, падала сваёй старэйшай дачцэ. — Ідзі ды добра слухай.

Адна за другой выбягалі дзяўчаты за дзверы. Апошняй выйшла высокая, хударлявая Манюся, малодшая гаспадыніна дачка. Вярнулася хутчэй за ўсіх ды надта ўсхваляваная. Кінула лыжку на стол.

Маці і дзяўчаты ўстрывожыліся:

— Што такое сталася?

А Манюся са злосцю:

— Ці ж можна тут толкам паварожыць? Базылюковы сабакі заўсёды галодныя — брэшуць, аж вешаюцца на ланцугах!

Дзяўчаты пачалі спачуваць Манюсі, а Тэкля зарагатала на ўсю кухню.

— Чаго вы смеяцеся? — здзівілася Манюся.

— А чаму ж ты злуеш? То ж у Базылюка два кавалеры! Ці адзін з іх не можа быць тваім мужам?

— Я і слухаць пра тое не хачу! — абурылася Манюся. — Яны мне з маленства надакучылі. Такія жулікаватыя: то кветкі рвалі, то ў садок улазілі.

— Гэта было калісьці, — не сунімалася Тэкля. — А цяпер, бач, аднаго ў гмінную раду выбралі, а другі ў афіцэрскую школу збіраецца... — Крыху памаўчаўшы, яна быццам да сябе сказала: — А ўсё ж з гэтага можа штосьці выйсці... Хто ведае?

Гаспадыня акрасіла куццю, абклала яе скваркамі. Паліла багата салам аўсяны кісель.

Дзяўчатам сказала:

— Бежыце ўжо дахаты. Павячэрайце. То ж сёння ў кожнай хаце багатая вячэра, каб увесь год багата вялося. Пасля прыбягайце, я вас коржыкамі пачастую — дзеля вас і напякла.

— Дзяўчаты, пасля вячэры прыходзьце да мяне, — азвалася Каця. — Мая бабуля ведае многа даўнейшых звычаяў, яна нам і варажбу напэўна падкажа.

— Ой, праўда! Пойдзем да бабулі Марчыхі! — зашчабяталі дзяўчаты.

А Тэкля на тое:

— Ідзіце-ідзіце. Марчыха — ведзьма неблагая, многа дзе чаго ведае.

Дзяўчаты выходзілі, накідваючы на сябе вопратку і дамаўляючыся, хто што прынясе на пачастунак. Каця сказала, што яе бабуля наварыла многа кісялю з журавінаў — хопіць усім.

Ніна заслала стол ільняным, яшчэ да вайны вытканым абрусам, паставіла міскі з ежай і запрасіла Тэклю.

Дзяўчаты хутка павячэралі і пабеглі да Каці.

Удовы-сяброўкі доўга яшчэ сядзелі за сталом. Успаміналі сваю маладосць, бедавалі, як вясной абрабіць поле.

На ганку затопалі і загаманілі хлопцы, і зараз жа вялікай гурбою ўваліліся ў хату.

— Добры вечар, цёткі, а дзе дзяўчаты?

— А хто іх ведае? Пабеглі ўжо кудысьці, — адказала Ніна. — Ідзіце, шукайце. Ведаеце ж, дзе зборышча бывае.

Хлопцы выйшлі, а Ніна ўзяла венік і хацела змесці снег, што яны прынеслі за нагамі.

— Ой, не рабі гэтага! — раптоўна паўстрымала яе Тэкля. — У сённяшні вечар хату не мятуць, бо чужыя куры будуць у агародзе дзерці. Збяры снег рукамі.

— Вось, бачыш, а я пра гэта і не ведала, — задзівавалася Ніна і паставіла венік у кут.

Тэкля нібыта пачала збірацца дадому. У той жа час думала: „Куды тут яшчэ заглянуць?"

— Не ідзі яшчэ, — азвалася Ніна. — Давай і мы паварожым.

Тэкля шчэ спадзявалася выйсці замуж і з цікаўнасцю глянула на сяброўку. А тая ўзяла дзве цыбуліны, падала Тэклі і сказала:

— Аблупі і адрэж дванаццаць роўненькіх кружочкаў.

Сама ж узяла днушку і пачала ўкладваць кружочкі і пры кожным называць месяц: „Студзень, люты, сакавік..." і так аж па снежань.

— Заўтра, — сказала, — паглядзім, які кружочак заросіцца, той месяц будзе мокры.

Тэкля страціла ахвоту да гэтай варажбы. Яна ж думала, што будзе пра замуж!..

А дзяўчаты сабраліся ўжо ў Каці. Ад вайны яна засталася круглай сіротой і жыла з бабуляй і дзедам.

Бабуля Марчыха, разліваючы кісель у кубкі, сказала:

— Там, на печы, у рэшаце, нарыхтавала я пшаніцы. Няхай каторая з вас пойдзе з Кацяй у куратнік. Прынясіце курку. А вы ўсе па жменьцы насыпце ля парога пшаніцы. Толькі запамятайце кожная сваю жменьку.

Каця з Воляй прынеслі курку, паставілі яе ля парога ды самі хутчэй насыпалі па жменьцы зярнят.

Усе чакалі, чыю горбачку пачне дзяўбці курка. А тая спрасонку не ведала, што рабіць. Неяк смешна перакрыўляла галаву, пераступала з нагі на нагу і каштаваць зярнят нават не збіралася. Бабуля пачала яе заахвочваць:

— Цю-цю-цю... Ку-у-у-у-рачка, курачка, — і перабірала пальцамі, быццам сыпала зярняты.

Курка пакруцілася і дзеўбанула ў Каціну пшаніцу. Каця была наймалодшая і ўсе здзівіліся, але пільна ўглядаліся, чыю пшаніцу будзе дзяўбаць птушка.

— Запамятайце толькі, у якой чарговасці яна дзяўбе, бо так і замуж будзеце выходзіць, — папярэдзіла бабуля.

Курка падыходзіла то да той горбачкі, то да іншай. Разагрэлася і пачала нават разграбаць пшаніцу. Дзяўчаты заўважылі, што яна якаясьці ненармальная: дзяўбе не па парадку і перасталі сачыць за ёю.

Бабуля злавіла курку, накрыла яе фартухом і сказала:

— Бярыце з міскі, што на прыпеку стаіць, па адной галушцы, апранайцеся і выходзьце на панадворак. Галушкі пакладзіце па чарзе ля сабачай буды. Я ж пайду і прытрымаю сабаку, каб не выскачыў раней. Будзеце ўглядацца, у якой чарговасці ён будзе хапаць вашы галушкі. Важна, каб прыкмеціць, ці праглыне на месцы, ці дзе адвалачэ. Пайду я першая, бо ён у нас злосны і можа кінуцца на вас.

Паслухаўшы, ці няма дзе блізка хлопцаў і ці тыя не перашкодзяць ім у гэтай гульні, дзяўчаты выйшлі на панадворак. Бабуля лашчыла Бобіка, а яны паклалі свае галушкі перад будаю і адышлі пад плот.

Бабуля гладзіла сабаку ды прыгаварвала:

— Вось дастанеш штосьці... Усе свае — не брашы, — і сунула яму скарынку хлеба.

Бобік выскачыў з буды і здзівіўся: чаму тут такое зборышча ды сёння яго лашчыць гаспадыня. Бывала, гэтак рабіў гаспадар, асабліва, калі ён добра напалохаў суседавых курэй. Але ж сёння нічога такога не было! Ён ужо спаў у будзе, закапаўшыся ў сена, і тут раптам яго вывалаклі. Упёрся ва ўсе чатыры лапы і на ўсялякі выпадак пачаў злосна бурчэць на спалоханых дзяўчат.

— Эй, каб табе добра не было! — крыкнула бабуля. — Глянь, што пад носам.

І пачала паказваць сабаку пшанічныя галушкі.

Бобік схапіў некалькі сярэдніх, а пасля ўзяўся за крайнія і пачаў насіць іх у буду. Адну схапіў і павалок недзе далей.

— Ну і праўдзівая ж варажба! Не кожная дзяўчына выходзіць замуж на месцы. Бывае, павалакуць яе кудысьці, бы Бобік тую галушку, — разважала бабуля.

Яна нават забылася сачыць за Кацінай галушкаю. Так і не зведала, у якой чарговасці Бобік схапіў яе.

Пачуўся хлапечы гоман на вуліцы, і дзяўчаты ўбеглі ў хату. Бабуля ім параіла:

працяг ☞8

Маё пяро было не так лагоднае

Калі чалавек старэе, а вось прыбыў зноў адзін год (пішу гэта 3 студзеня 2010 ужо года), то становіцца для наваколля зусім лагодны, быццам ён не карэспандэнт „Нівы", толькі анёл.

Яшчэ некалькі гадоў маё пяро было не так лагоднае для думак ці то ніўскіх карэспандэнтаў, ці ніўскіх публіцыстаў, як цяперашнія прагрэсіўна палагаднелыя клавішы клявіятуры камп'ютара. Калісь хацелася пісаць пра розныя справы з наіўнай надзеяй, што зярно думкі, прапановы ці іншай ідэі, калі не зараз, то некалі ўзыдзе ў форме нейкай рэчаіснасці. Пра падвойныя дарожныя ўказальнікі пісаў я, бадай, у 1982 годзе, а ідэя, бо як жа назваць кінутую ў „беларуска-беластоцкі прастор" прапанову, рэальныя кшталты набывае або набудзе ў 2010 годзе — на пачатак у Арлянскай гміне.

Ёсць надзея, што зварушыцца застылае грамадскае беларускае асяроддзе ў пачаўшымся годзе хаця б з-за самаўрадавых выбараў, аб чым пісаў галоўны рэдактар „Нівы" і заадно старшыня Беларускага саюза Яўген Вапа ў „Ніве" ад 27 снежня мінулага года. Каб выбары не былі свайго роду палітычным тэатрам, Яўген Вапа ставіць задачу перад усім перад рэдакцыяй тыднёвіка, але не толькі, каб бескампрамісна адлюстроўваць у рэдакцыйнай працы вельмі істотныя справы для беларускага грамадства.

Думаю, што перад усім удасца яму дысцыплінаваць ніўскіх валацугаў па сцежках і дарогах усходняй Беласточчыны, ці іншых гладкіх рэпарцёраў. Прыклад? Калі ласка. Для рэгіёна Белавежскай пушчы 100 млн. злотых дзяржаўнай беззваротнай датацыі гэта немалыя грошы. Цікава, калі грошы прападуць, калі не дойдзе да кампрамісу паміж самаўрадамі і Міністэрствам асяроддзя, а дзяржава і без іх пашырыць парк, то ці знойдзецца вінаваты такой сітуацыі? З рэпартажу-доследу Аляксея Мароза „Што з тым паркам?" („Ніва" ад 20 снежня 2009 г.) неяк не магу даведацца хто тармозіць размовы.

Старшыня Беларускага саюза і галоўны рэдактар „Нівы" Яўген Вапа, думаю, звяртаецца перш за ўсё да чытачоў тыднёвіка, і ў тым ліку да выбраных намі ўлад, каб неабыякава ставіліся да праблем беларускай нацыянальнай меншасці і заахвочвае да размовы.

З навагоднімі прывітаннямі рэдакцыі і чытачам

Міхась КУПТЭЛЬ

Кафедра беларускай культуры
Філалагічны факультэт
Універсітэта ў Беластоку

запрашае на

Беларускія чацвяргі інтэрдысцыплінарны канверсаторый

14 студзеня 2010
доктар Ірына Багдановіч
„Беларуская літаратура XIX ст. — спроба ідэнтыфікацыі, мастацкі пераклад"
17.00, вул. Лінярскага 3, зала 1Б

Пасля пяці гадоў у Еўрасаюзе

Міхал МІНЦЭВІЧ

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

— Ці еўрасаюзныя даплаты паўплывалі на паляпшэнне жыцця сялян? — распытваў я напатканых земляробаў і пенсіянераў з некаторых вёсак сваёй гміны.

— А які Еўрасаюз дае?! Гэта ж нашы польскія грошы. Мы ўносім у еўрасаюзную касу, а атрымліваем менш. (Паводле інфармацыі ў 2008 годзе польскія сяляне атрымалі на шаснаццаць мільярдаў злотаў больш — М. М.). І адразу Еўрасаюз указвае на якія гэта мэты — патлумачыў мне пенсіянер Алёша Ляўчук з Кашалёў, а падтакнуў яму пенсіянер з Шарнёў. — І што з тых даплат? Пры камуне селянін вёз прадаць паўцэнтнера жыта і купляў амаль тону ўгнаенняў. А сёння тона ўгнаення каштуе тры тысячы, а трыцікале купляюць па сорак злотаў. Сёлета не даюць структурных пенсій, бо няма грошай.

— Але зараз зямля добра плаціцца, і ў каго яе многа, дык той багацей? — дапытваю.

— Бывае так, што ў селяніна, уласніка вялікай гаспадаркі, усе машыны спісаны ў банкаўскі залог. І калі б яму гэта забралі, то астаецца сама зямля — і пагаспадаруй тады. Вось закрылі цукроўню ў Лапах. Аднаму ўдалося зараз закантрактаваць сто гектараў буракоў, але куды іх здаць? Мусіць везці аж у Люблін.

Некалькі гадоў таму прадаў я крыху гектараў па пяць тысяч злотаў, а сёння за гектар зямлі плацяць па дзесяць і нават па дваццаць тысяч. Але што гэта за грошы?

А я бачу змену стаўлення да аблагоў. Яшчэ дзесяць гадоў таму некаторыя ўласнікі пустых бацькоўскіх будынкаў (хлявоў, клуняў і т.п.), каб не плаціць за іх вялікіх падаткаў, арандавалі ў гміне гектар зямлі (найчасцей лугоў, асабліва ў наваколлі Вулькі-Выгаоўскай), нават не ведаючы, дзе той „іх" участак знаходзіцца. Іншыя арандавалі, каб прыкінуцца сялянамі і мець магчымасць страхавацца ў КРУСе дзеля пазнейшай пенсіі, або дзеля льгот у вядзенні нейкага бізнесу. Зараз і ў гэтай дзялянцы, з увядзеннем даплат, многае памянялася. У гміне, як я даведваўся, вольных для арандавання грунтаў амаль няма. Адна жанчына з Маскаўцаў заўважыла, што сёння ўжо няма ахвотных прадаваць зямлю, зямля занятая. Па вёсках жывуць пенсіянеры, але іх зямлёй загадваюць дзеці або ўнукі.

Вяртаюся да размовы са спадаром Алёшам Ляўчуком і кажу яму, што цяпер, мабыць, лепш, бо згодна еўрасаюзным патрабаванням, у аборах каровы стаяць між сцен, абкладзеных керамічнымі пліткамі.

— А дзе там! Зайдзі і паглянь. У таго, у каго стаялі ў гнаі, там і надалей яны стаяць. А ў Галандыі не стаяць? Па тэлебачанні паказваюць, што і там бруднае быдла.

— Аднак па вёсках многа самаходаў, — не здаюся.

— Якія гэта самаходы, гэта лом! Заўваж, што пры камуне ў кожнага гаспадара стаяў на панадворку трактар, або і два. А сёння пуста.

— Вялікія трактары...

— А хто іх мае! Мусіў бы паўстагоддзя грошы на іх збіраць. Згода, тыя нямногія, што іх купілі, атрымалі на гэта нейкія даплаты.

Герэк адмяніў абавязковыя пастаўкі і завёў вольны рынак. Было добра і на вёсцы, і ў горадзе. Было дабра, бо калі хто заяўляў пра недастаткі, напрыклад, на прадаўшчыцу, то заводзілі парадак. А сёння да каго пойдзеш? Калісь на маніфестацыях крычалі „Прэч з камунай!", а сёння крычаць „Зладзеі!"

— Чаму сяляне заўсёды наракаюць? — пытаю.

— А хто ніколі не наракае?

Мой чарговы размоўца Вальдэмар Ёдла з Вулькі каля Орлі гадуе некалькі малочных кароў, але раней быў у яго статак. Гадоўлю паменшаў, бо па многіх прычынах яна яму не аплачвалася; сам ён нежанаты, а бацькі на пенсіі. Згадваю яму пра Еўрасаюз...

— Каб не гэтыя даплаты і не пенсія бацькоў, то на гаспадарцы было б вельмі цяжка. Калісь, калі не было даплат, то селянін трымаў бычка і ведаў што будзе, калі пасля двух гадоў яго прадасць; тады можна было планаваць. А цяпер спакойных планаў няма.

Мой ранейшы субяседнік, спадар Ляўчук, сказаў на гэты конт:

— Што з той гадоўлі бычка? Гадуй два гады і дзве тысячы атрымаеш.

Сцяпан Каляда з Кашалёў мяркуе інакш:

— Бычка варта гадаваць! Ну, калі ў каго грошай многа, то яму тыя дзве тысячы пусцяковіна. Даплата таксама патрэбная, напрыклад, маладой сям'і з двойкай дзяцей цяжка выжыць з дзесяці гектараў і даплата ў тры-чатыры тысячы многа дае.

Сцяпан Кулік з Маліннік:

— Тры-чатыры тысячы злотаў у год? Гэта мусіць быць буйны гаспадар (які мае больш за дзесяць гектараў — М. М.), а такіх у нас мала. Калісь я купляў чатыры тоны ўгнаенняў і вёз іх трактарам, а сёння бяру мяшок у свой „Паланез".

А самаходы па вёсках цяпер якія? За паўтары тысячы купіш і будзеш ездзіць. Структурныя пенсіі, тыя што давалі спачатку, былі добрымі грашамі, па дзве тысячы, а цяпер то і на пенсіі грошай не маюць нават.

Цікава заўважыць, што спачатку, калі структурныя пенсіі здаваліся быць вялікімі, не ўсе сяляне былі ахвотныя кідаць гаспадаранне, нават калі прыбытак ад яго быў у некалькі разоў меншы ад тых пенсій. Адна жанчына гаварыла мне:

— Ой, як мой не хацеў ісці на тую пенсію! Атрымаў больш дзвюх тысяч у месяц, а я атрымала крыху менш. Столькі грошай! У нас на гаспадарцы ніколі так не бывала.

— Мой калега ў ліпені мінулага года падаў дакументы на структурную пенсію, — кажа Яўген Ёдла з Міклашоў, — але не стала грошай, сказалі яму чакаць да наступнага года. А тыя, што падалі ў красавіку, атрымалі. Ці гэта справядліва?

Структурная пенсія толькі на дзесяць гадоў, а пасля шэсцьдзесят пятага года жыцця селянін атрымае пенсію з КРУСу. Той, хто напрыклад меў дзве тысячы або тысячу дзвесце, атрымае шэсцьсот злотаў і будзе дзіўна яму да гэтага прывыкнуць.

Размовы з іншымі сялянамі былі падобныя: нізкая цана малака — каля 65 грошаў, надта дарагія ўгнаенні (зараз іх сеюць у мінімальных колькасцях) і адсутнасць захаплення ранейшымі структурнымі пенсіямі, таннае збожжа. І дзіўна, што няма гаворкі пра рэзервы, пра запас збожжа, значыць Захад зрабіў так як задумаў і стварае ў нашай краіне рынак збыту. Сяляне заўважаюць, што абмежаванняў усё больш і больш, ліквідуецца шмат заводаў. І калі згадваю пра паляпшэнне, усе лічаць гэта жартам, адказваюць усмешкай. На іх тварах паяўляецца выраз бяссілля, знеахвочанасці і нават абыякавасці. Магчыма, што гэта ад іх пенсіянерскага ўзросту, але гледзячы з другога боку — менавіта ў гэтых людзей нажытыя мудрасць і вопыт. Міхал Кулік сказаў так:

— Не будзе добра ў свеце! Калі з сельскай гаспадаркай так добра, то чаму не кідаюцца гаспадарыць, толькі кідаюць гаспадаранне?

— Ведаеш, чаго трэба Орлі? — звярнуўся ён да мяне. — Трэба сюды прывезці дзве-тры пары яўрэяў; яны плодныя, маюць па сем-дзевяць дзяцей. І за пяцьдзесят гадоў Орля развінецца, і будзе тут багата і вучана.

* * *

З ліпеня настаў абавязак чыпавання коневых (коней, мулаў, аслоў). Адзін чып будзе каштаваць пяцьдзесят злотаў. За ўхілянне будзе пагражаць калегія. Статыстыкі паказваюць, што штогод крадуць у нас прынамсі па тысячы коней, якіх пасля вывозяць у Італію. У Арлянскай гміне коней амаль няма, бо іх перасталі гадаваць. У самой Орлі асталося іх тры-чатыры штукі; кароў яшчэ крыху больш. Пашы дзічэюць і паволі зарастаюць самасеем.

Што з малаком?

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

У многіх нашых земляробаў, што гадуюць па 1-4 каровы, прадукцыя малака можа апынуцца на грані рэнтабельнасці

Да ліквідацыі цераспалосіцы ў многіх нашых сёлах каровы пасвіліся на супольных вясковых лугах, а гаспадарам з прыпушчанскіх тэрыторый часта прыходзілася ездзіць сушыць сена на лясныя паляны нават па 10-15 кіламетраў. Земляробы выкарыстоўвалі тады малако ў асноўным на патрэбы сваіх мнагадзетных сем'яў або іншых жыхароў вёсак. Толькі гаспадыні пражываючыя бліжэй гарадоў або гандлёвых цэнтраў рабілі сваім спосабам сыры, масла і прадавалі іх у гэтых мясцовасцях. Ад часу, калі пры народнай уладзе сталі ствараццa малочныя кааператывы і ўзнікла запатрабаванне на вялікую колькасць малака, нашы гаспадары пачалі гадаваць больш кароў. Грошы за прададзенае малако выплачваліся штомесяц і сталі пастаяннай крыніцай даходаў сялян. Аднак часцей большыя статкі кароў паяўляліся ў вёсках, дзе было многа прыродных лугоў. У іншых сёлах гаспадары найчасцей павялічвалі гадоўлю да 4-5 кароў і на гэтым спыняліся.

У Еўрасаюзе многа памянялася

Аднак пасля далучэння Польшчы да Еўрасюза ў справах жывёлагадоўлі многа памянялася. Некаторыя малодшыя гаспадары, карыстаючыся таннымі крэдытамі для сельскай гаспадаркі, сталі будаваць новыя, вялікія, абсталяваныя па-сучаснаму аборы або перабудоўваць існуючыя і павялічваць статкі да небывалых раней колькасцей — 30, 50, а нават і больш 100 кароў. Амаль у кожнай нашай гміне ёсць буйныя жывёлаводы. Па 30-40 кароў гадуюць яны найчасцей сваімі сіламі і з дапамогай сямейнікаў. Земляробы, у якіх статкі кароў налічваюць па 100-200 штук, наймаюць ужо работнікаў.

У гэтым самым часе выдатная большасць нашых гаспадароў стала масава пераходзіць на санацыйныя стандарты гадоўлі быдла. Асабліва там, дзе больш якасныя землі, нашы земляробы сталі паўсюдна абмяжоўваць гадоўлю свіней і кароў да мінімуму. Многія пенсіянеры, што апрацоўваюць яшчэ зямлю перапісаную на дзяцей або ўнукаў, увогуле пазбыліся кароў і гадуюць толькі па парцы свіней, каб закалоць іх пад святы і мяса ў асноўным раздаць маладым. Малако на свае патрэбы пенсіянеры бяруць ад суседзяў або купляюць у вясковых крамах. Некаторыя земляробы так, як было ў міжваенны перыяд, возяць малако пастаянным пакупнікам у Гайнаўку ці Бельск-Падляшскі, абмінаючы пасрэдніцтва малочных кааператываў. Афіцыйна лічыцца нават, што ў Польшчы каля 30% ад усёй прадукцыі малака выкарыстоўваецца на свае патрэбы або прадаецца па-за малочнымі кааператывамі і прадпрыемствамі. У гаспадароў, што гадуюць па дзве кароўкі, яны ізноў сталі пасвіцца ў садках, агародчыках і па-за клунямі суседзяў, якія ўжо раней зракліся гаспадарання, бо такім спосабам можна пазбыцца старой някошанай травы, аблагоў і кустоў.

— Зараз у Чыжах вельмі мала кароў, нашы гаспадары часта гадуюць па адной-дзве, а пенсіянеры і тых кароў пазбыліся. У нашай гміне толькі ў Кленіках гадуюць многа кароў. Апошнім часам атрымлівалі мы па 60-65 грошаў за літр малака. Калі б плацілі па 2 злоты за літр малочнай сыравіны, чыжоўскія гаспадары ізноў пачалі б гадаваць кароў, — заявіў чыжоўскі солтыс Андрэй Ціханюк.

Гадоўля па 5-10 штук кароў часцей сустракаецца ў тых нашых сёлах, дзе горшыя землі або многа прыродных лугоў, якіх па розных прычынах нельга пераўтварыць у ворыва і засеяць збожжам. Прыродныя лугі знаходзяцца між іншым на кленіцкіх землях.

На Захадзе пратэстуюць

Усіх нашых гаспадароў, якія трымаюцца гадоўлі малочных кароў на ўзроўні васьмідзесятых і дзевяностых гадоў мінулага стагоддзя або разгарнулі яе, моцна спасцігла вялікае паніжэнне цэн малочнай сыравіны ў мінулым годзе. Калі ў прададзеным малацэ не было многа бялку, пастаўшчыкі, што гадуюць па некалькі кароў, атрымлівалі восенню толькі па 60-65 грошаў за літр якаснага малака (летам бывала нават менш, па 50-60 грошаў). Калі павышалася колькасць бялку, цана якаснага малака ўзрастала ў невялікага гадоўцы да 65-75 грошаў за літр (буйныя гадоўцы атрымлівалі ў нас нават па 0,9 злота і больш за літр сыравіны). Кошты малочнай прадукцыі — вышэйшыя ў Заходняй Еўропе, а ў Францыі і Германіі, дзе прадукуецца вельмі многа малака, цана яго таксама нізкая. Восенню плацілі там у сярэднім па 0,25 еўра за літр малака, а летам цана была яшчэ ніжэйшай і месцамі плацілі па 0,15 еўра за літр. У другой палове мінулага года фермеры з заходніх краін Еўрасаюза сталі гаварыць аб нерэнтабельнасці малочнай прадукцыі і моцна пратэставалі супраць такім нізкім цэнам на скупцы малака (у 2008 годзе атрымлівалі яны нават па 0,30-0,35 еўра за літр, а ў 2007 годзе яшчэ больш). Французскія фермеры сталі выліваць малако на палі, а пасля сталі раздаваць малако ў вялікіх гарадах людзям. Каб падтрымаць пратэст земляробаў, французскія гараджане прыходзілі з бутэлькамі і бясплатна бралі малако ад земляробаў. Пратэстуючыя фермеры ў розных краінах Еўрасаюза вылілі перад установамі каля 40 мільёнаў літраў малака. Французскія земляробы сталі арганізаваць і іншыя пратэсты, напрыклад, раскідаць у Парыжы сена і паліць шыны, а ў іншых месцах Францыі фермеры выязджалі на вуліцы трактарамі і выводзілі на іх кароў, свіней і авечак. Вытворцы сельскагаспадарчай прадукцыі з заходніх краін Еўрасаюза сталі патрабаваць большай дапамогі ад Еўрапейскай камісіі. Прапанавалі скупку малака за выдзеленыя еўрасаюзныя сродкі, хацелі большых даплат да экспарту малочных прадуктаў і ўтрымання канцэсій на малочную прадукцыю прынамсі да 2020 года. Адны гараджане з еўрасаюзных краін глядзелі са спачуваннем на пратэстуючых, а іншыя з абурэннем.

— У нас таксама слабая рэнтабельнасць сельскагаспадарчай прадукцыі, аднак у Польшчы гаспадары не пратэстуюць. Раней выступалі ў абарону земляробаў, а зараз таго няма, — кажа Ян Адамчук з Чыжоў.

Чаму так моцна патаннела малако?

Спецыялісты звяртаюць увагу, што багацце еўрасаюзнай малочнай прадукцыі было часткова збудаванае на плячах земляробаў з-па-за Еўрасаюза. Напрыклад, з еўрасаюзных краін у Афрыку высылалі так таннае малако, што дабавіўшы да яго крыху вады, было яно нават таннейшым ад мясцовага і спрычынілася гэта да вялікага абмежавання гадоўлі кароў у афрыканскіх краінах. Ад сістэмы вельмі моцнага дафінансоўвання малочнай прадукцыі Еўрасюз стаў адыходзіць на зломе 2007/2008 гадоў, беручы пад увагу пратэсты сваіх спажывецкіх арганізацый і міжнародных арганізацый з-па-за Еўрасаюза. Якраз у гэтым самым часе цэны малака, сыроў і іншай малочнай прадукцыі пайшлі высока ўверх і, напрыклад, сухое малако было даражэйшым чым год назад ажно на 90%. Спецыялісты прадвяшчалі такую добрую кан'юнктуру прынамсі на працягу дзесяці гадоў. У Польшчы ў гэтым часе, так як у некаторых іншых краінах Еўрасаюза, сталі ўзбуйняцца малочныя гаспадаркі і заўважальна пабольшала колькасць малака. Аднак усё адмянілася ўжо ў 2008 годзе і гэта супала з абмежаваннем даплат да малочнай прадукцыі. Зараз даплаты да 100 кілаграмаў сухога малака экспартаванага па-за Еўрасаюз складаюць 22,5 еўра, а яшчэ некалькі гадоў назад было гэта нават у 5 разоў больш. Калі стала падаць цана малочных вырабаў на свеце і адначасна абмяжоўваліся даплаты да малочнай прадукцыі ў Еўрасаюзе, гэта давяло да вялікага паніжэння рэнтабельнасці малочнай прадукцыі. Фермеры з еўрапейскіх краін баяцца, што прыйдзецца ім моцна скарачаць малочную прадукцыю або нават пазбывацца кароў і таму пратэстуюць.

У многіх нашых земляробаў, што гадуюць па 1-4 каровы, прадукцыя малака можа апынуцца на грані рэнтабельнасці. Гэтых гаспадароў падтрымліваюць яшчэ заўважальныя еўрасаюзныя даплаты да апрацоўваных палёў і вельмі нізкія кошты прадукцыі. Нашы вясковыя людзі практычна не лічаць сваёй цяжкай работы. Пенсіянеры, што гадуюць па адной кароўцы, асабліва не сочаць ужо за цэнамі малочнай сыравіны, бо самі карыстаюцца сваім малаком і прадаюць яго вяскоўцам. Рады таксама, што кароўка выесць траву на панадворку і па-за ім.

Малога памежнага руху прыйдзецца пачакаць

Дамова аб малым памежным руху не ўступіць у сілу, як чакалася, у першай палове 2010 года — перакананы дэпутат польскага Сейма ад Падляшша Яраслаў Матвеюк. Так вынікае з адказу на чарговы, ужо сёмы, дэпутацкі запыт, які **Яраслаў Матвеюк** атрымаў ад міністра замежных спраў Польшчы. Паводле падлікаў дэпутата, нават калі міністры замежных спраў Польшчы і Беларусі падпішуць дамову ў студзені, то дамова ўступіць у сілу ў другой палове 2010 года. — *Ратыфікацыйная працэдура ў Сейме цягнецца 2-3 месяцы. Потым яе ратыфікаванне прэзідэнтам Рэспублікі Польшча, потым публікацыя і ўступіць у сілу праз 14 дзён пасля публікацыі. Гэта ўсё ўказвае на тое, што пры самым добрым раскладзе дамова ўступіць у сілу ў другой палове года. А любое яе замаруджванне — перасуне яе на канец 2010 года.*

Яраслаў Матвеюк адзначае, што марудныя тэмпы працы над дамовай аб малым памежным руху яму незразумелыя. — *Аднак,* — адзначае дэпутат, — *дыпламатычныя службы і Польшчы, і Беларусі павінны перш за ўсё прыняць пад развагу патрэбы памежнага рэгіёна, які чакае фіналу дамовы, як штуршка для эканамічнага ажыўлення рэгіёна, а гэта толькі на польскім баку датычыць 800 тысяч людзей, якія жывуць у 30-кіламетровай зоне ад беларускай мяжы.*

Радыё Рацыя

Беласток

„Ніва" пісала і...

У мінулым годзе не адзін раз пісаў я пра праблемы з даездам аўтобусамі гарадской камунікацыі ў Саўляны і далей у Каракулі ды Цяснэ — вёскі на ўскраіне Беластока. Аўтобусы едучы на канец вуліцы 27 Ліпеня (да цяплiцы) спазняліся нават на 20 хвілін. Чаму? Быў гэта вельмі небяспечны адрэзак — вузкі, ухабісты і на дадатак да нядаўна цёмны (ноччу неасветлены).

Дык вось 29 снежня 2009 года пры вул. 27 Ліпеня ад кругавога скрыжавання вуліц Бжэхвы ды Далістоўскай да мяжы горада закончылі пабудову вулічнага электраасвятлення. Цяпер куды бяспечней сюдою ехаць або ісці пехатой. Гэтая інвестыцыя цешыць навакольных жыхароў і вадзіцеляў аўтамашын і аўтобусаў, якія сюдою ездзяць. Цяпер паправілася бачнасць.

Інвестыцыя каштавала 285 тысяч злотых. Гэта чарговая г.зв. навылётная дарога з горада, якая дачакалася асвятлення (у лістападзе 2009 г. пабудавалі яго яшчэ па вуліцы Папялушкі).

„Ніва" крытыкавала непаладкі на аўтобуснай лініі № 13 і крытыка не прайшла бясследна.

(яц)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Калядоўшчыкі ў заснежаных вёсках!

У перадачу „Падляшскі канцэрт пажаданняў", якую ў трэці дзень Каляд выпусціла Радыё Рацыя, званілі школьнікі. Радак Сідарук з вёскі Хітра павіншаваў сваіх сяброўшасцікласнікаў з Новага Корніна. Мяне прыемна ўразіў гэты званок, бо ў апошняй крыжаванцы „Зоркі" школьнікі з Новага Корніна ўзялі амаль усе ўзнагароды. Актыўнасць і забава спалучалася тут з беларускай мовай і песняй...

Аднак сярод святочных віншаванняў найважнейшыя жывыя калядкі. У наваколлі Бельска і Гайнаўкі калядуюць з першага дня Раждзяства Хрыстовага да Трох каралёў. Першы дзень належыць дзецям і моладзі. Дарослыя ідуць у Новы год або на Трох каралёў. Свой заробак звычайна аддаюць на царкву. У гэтым годзе дзеці і моладзь з Ласінкі, аб'яднаныя ў прыцаркоўных калектывах „Заранка" і „Рамонак", калядавалі на новы іканастас у парафіяльнай капліцы. На другі дзень паехалі ў Беласток з народным канцэртам.

Згодна традыцыі, я пайшла калядаваць з дачкой у роднай вёсцы Катлоўка. Мы развучылі старажытную калядку-кант *Днесь поюшчэ* паводле архіўнага запісу, зробленага ў 1978 годзе ў Стрыках. Той запіс памешчаны на кампакт-дыску са старабеларускімі калядкамі, выдадзеным Музеем малой айчыны ў Студзіводах. Спачатку наш намер пакрытыкавала сямейка: *Хто сёння захоча слухаць такую доўгую і несучасную калядку?!*

Але мы заўпарціліся. Калі мы пачыналі спяваць, людзі выключалі тэлевізары. Амаль усе запрашалі за стол, праводзілі пасля за брамку, дзякавалі, што не забываем...

Калядоўшчыкі з Кавелы

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Катлоўска - беластоцкі квартэт

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Па дарозе мы сустрэлі калядоўшчыкаў з Ласінкі, Кавелы і Беластока. Першыя як што год спявалі калядку на беларускай літаратурнай мове *Учора з вячора*, другія і трэція папулярную калядку на дыялекце *Коляда-коляда*... Нам найбольш спадабаліся хлопцы з Кавелы. Каб пераадолець дарогу ў нашу вёску, яны ішлі праз сумёты тры кіламетры. І як належыцца сапраўдным калядоўшчыкам, прыйшлі з гвяздай!

Радасны настрой свята мацавалі лёгкі марозік і снег, які засыпаў дарогі, дрэвы і дамы. І радасць ад сустрэчы з людзьмі, якія з адкрытым сэрцам сустракалі спевакоў і запрашалі праз год... Варта пра гэта памятаць.

ЗОРКА

Беларуская народная казка

Не сілай, а розумам

Адзін чалавек пайшоў у лес дровы секчы. Насек дроў, сеў на пень адпачыць. Прыходзіць мядзведзь.

— Гэй, чалавеча, давай будзем барукацца! Паглядзеў чалавек на мядзведзя: дужы калмач — дзе з ім барукацца! Сцісне лапамі — і дух вон!

— Э, — кажа чалавек, — што мне з табою барукацца! Давай спярша паглядзім, ці маеш ты сілу.

— А як глядзець будзем? — пытаецца мядзведзь.

Узяў чалавек сякеру, расшчапіў пень зверху, убіў у расколіну клін і кажа:

— Калі раздзярэш гэты пень лапаю, — значыць маеш сілу. Тады я з табою буду барукацца.

Ну, мядзведзь, не падумаўшы, тыц лапу ў расколіну. А чалавек тым часам трах абухом па кліне — той і выскачыў.

Тут пень і сціснуў мядзведзеву лапу, як абцугамі.

Раве мядзведзь, танцуе на трох лапах, але ні расшчапіць пень, ні вырвацца з яго не можа.

— Ну што, — кажа чалавек, — будзеш барукацца са мною?

— Не, — енчыць мядзведзь. — Не буду.

— Вось бачыш, — сказаў чалавек. — Не толькі сілаю барукацца можна, а і розумам.

Убіў ён клін назад у пень, мядзведзь вырваў лапу ды ходу ў гушчар без аглядкі.

З таго часу ён і баіцца сустракацца з чалавекам.

Сямейка Аўксенціюкоў з Ласінкі

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Марыянна САДОЎСКАЯ

Незавершанае жыццё

Здаецца,
што не кончыў жыцця.
А можа забраў яго злодзей ценяў?
Гэтая малая дзяўчынка
з-пад старога касцёла сказала,
што падаў руку чорту
і пайшлі кудысьці разам.

У цяні сонца гэты мужчына
быў выпадковым героем.
Музай артыстам,
натхненнем паэтам.
Меў твар Анёла.
Калі чалавек спатыкнецца
— шчаслівы дэман,
злодзей нашых душ.

Дзяўчынка з-пад старога касцёла
бачыла: мёртвыя галубы
варкавалі на галінках.

За кожны камень
прайгранага жыцця
аддам частку сябе,
каб ніколі
не мусіла
іграць з чортам.

Дым

Бацьку

Зноў закурыў.
Калі канчаў, сядаў у кухні,
абіраў яблычак, дзяліў на чатары
— тры для мяне, адно для Яго.
Вырэзваў асяродкі з семкамі.
Потым сядаў у фатэль.
Вечарам быў ужо ў сваім пакоі.
Перакладваў запісаныя старонкі.
У паветры віўся дым з папяросы.
Хадзіў спаць позна.
Уставаў рана.
На стале чакалі кава і попельніца.
Пакаваў бутэрброды і ехаў на працу.
Заўсёды вяртаўся...

Бацька

Тату

Гэты мужчына з папяросай
сядзеў заўсёды у кухні...
Не, яшчэ не вярнуўся.
Ездзіць па свеце.
Прабачце... Ах, так, я пакінуў
свой ножык.
Не любіў гальштукаў,
мулялі ў шыю.
Ох, умеў разбудзіць ноччу сябра
ў палаце ў бальніцы,
каб расказаць анекдот.

Дзе ён цяпер?
Ніхто не ведае.
Не ўзяў з сабою
ніякага багажу,
толькі нашы здымкі...

Нарва

http://www.narew.gmina.pl

На Падляшскай зямлі мала так цікава распаложаных мясцовасцей як Нарва. Пабудаваная непасрэдна каля рэчкі мае яна таксама вельмі цікавую драўляную архітэктуру.

Нарва сваю назву ўзяла ад аднайменнай рэчкі, якая пераплывае праз беларускія землі Падляшша. Варта тут падкрэсліць, што гэты абшар быў заселены вельмі даўно, аб чым сведчаць рассеяныя тут шматлікія гарадзішчы.

Жыццё Нарвы заўсёды было непасрэдна звязанае з рэчкай. Ад XV стагоддзя праз рэчку ў гэтым месцы перапраўляўся той, хто падарожнічаў па маршруце Кракаў — Вільня. Варта падкрэсліць, што гэты абшар належаў замку ў Бельску. Якраз у Нарве пабудаваны быў рачны порт, дзякуючы якому бельскія мяшчане маглі прадаваць і гандляваць сваімі таварамі ды сплаўляць іх ракой.

У гэты перыяд рака Нарва была вельмі важным гандлёвым шляхам, які спалучаў Падляшша з паўночнымі абшарамі, асабліва з горадам Гданьскам. Асаблівую ролю Нарвы заўважылі таксама каралі. У 1529 годзе атрымала яна магдэбургскае права і стала горадам.

Каралеўскі двор у Нарве карыстаўся дастатковай папулярнасцю сярод манархаў. На начлег падчас падарожжаў затрымліваліся тут між іншым каралева Бона ды кароль Стэфан Баторый.

Развіццё Нарвы, як і многіх іншых падляшскіх мясцовасцей, спынілі войны XVII-XVIII стагоддзяў.

Вялікую частку жыхароў Нарвы ў перыяд да II сусветнай вайны складалі яўрэі. У большасці займаліся яны гандлем, але таксама былі сярод іх лекары ды пекары. Падчас II сусветнай вайны на частцы тэрыторыі Нарвы створанае было гета.

Пра яўрэяў, якія склалі вельмі важную частку гісторыі Нарвы, сёння нагадваюць яўрэйскія могілкі і драўляная забудова ў цэнтры мясцовасці, якая сёння не з'яўляецца ўжо горадам.

У Нарве варта таксама пабачыць два вельмі цікавыя сакральныя аб'екты: драўляную царкву XIX стагоддзя ды не менш прыгожы драўляны каталіцкі касцёл XVIII стагоддзя.

Міхась СЦЕПАНЮК

Музыка з кайфам

Nagualia — свет „НагУалю"

Як стаць папулярным музыкам у Беластоку? Існуюць прынамсі два спосабы. Трэба называцца „Серебряная свадьба" або „НагУаль". Зразумела справа не ў самой назве. Патрэбны і канкрэтныя ўмовы. Па-першае, трэба быць з Беларусі. Па-другое, трэба граць даволі арыгінальна, не там нейкі рок, поп ці метал. Паколькі „Серебряная свадьба" ўжо гасцявала ў нашай рубрыцы, то пра „НагУаль" варта згадаць, асабліва таму, што паяўляецца ён не толькі на адмысловых канцэртах, але таксама запрашаюць яго на вялікія музычны шоў тыпу „Вялікага аркестра святочнай дапамогі".

„НагУалем" і іншымі нестандартнымі гуртамі з Беларусі цікавяцца ў Беластоку людзі звязаныя з альтэрнатыўнай культурай і мастацтвам. Можа таму, што і пэрформэнс, які рыхтуюць сваім гледачам, далёкі ад прапаноў папулярных радыёстанцый. „НагУаль" узнік у 2000 годзе проста з патрэбы сэрца. Самі пра сябе пішуць, што іхні фальклор такі, які ім атрымаецца. Натхняе іх прырода, якую пазнавалі з дзяцінства, адклікаюцца да сваіх дзядоў і продкаў, якія перш за ўсё навучылі іх любіць. Затое крытыкі распісваюцца пра свабоднае інтэрпрэтаванне і адыгрыванне эмоцый, глыбокае адчуванне сябе, прыроды і свету. Яны дадаюць, што інспірацыі ў іх здараюцца на кожным кроку. Кожны дзень ім вартасны і патрэбны і гэтым карыстаюцца музыкі „НагУалю". У адкрыванні эмоцыяй дапамагаюць ім шматлікія інструменты, між іншым, джэмбэ, народныя бубны, цымбалы, акарына, кантрабас ці тайская флейта.

За гады сваёй дзейнасці „НагУаль" паспеў зайграць больш за шэсцьсот канцэртаў, выступіць перад публікай немалой часткі Еўропы. Апрача Беларусі выступалі ў Расіі, Нямеччыне, Літве, Францыі, Украіне, Румыніі, Малдове, Фінляндыі, Швейцарыі, Венгрыі і Польшчы. А ў час доўгіх маршрутаў проста ствараюць чарговыя чароўныя, не з гэтага свету, кампазіцыі.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 3

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 51:

Гармонік, шар, рап, фірма, мова, радок, дыктоўка, саха, сотка, мікра, неба, Кітай. Ар, грамада, подых, вока, факт, Нарваўскі, корт, квадрат, каляндар.

Узнагароды, фламастэры, выйгралі **Віялета Рушук, Ілона Ялоза, Уршуля Васілюк** з Новага Корніна, **Габрыела Снарская** з Бельска-Падляшскага, **Рафал Вакулюк** з Арэшкава. Віншуем!



3 ☞ працяг

Шчадруха

— Ідзіце ў пакой, пагрэйцеся. Адно ціхенька праходзьце праз спальню, каб не разбудзіць дзеда.

Дзяўчаты адна за адной прасоўваліся праз вузенькую спальню, у якой дзед Марка пасвіствaў праз нос, лежачы нейк да паловы на ложку, з нагамі на табурэце. Ногі былі абуты ў валёнкі без галошаў і смешна тырчэлі ўверх. Жывот жа быў прыкрыты кажушком.

Каця ўсвядоміла сваіх сяброўак, што гэтак дзед адпачывае пасля вячэры.

У пакойчыку яны сядзелі без святла. Размаўлялі аб нядаўняй варажбе. Смяяліся.

І тут дзед Марка пачаў шамолькацца, адсоўваць табурэт, мармытаць нешта. Каця хуценька запаліла святло.

Дзед прасунуў галаву паміж ільняныя заслонкі ў дзвярах пакойчыка, паморгаў крыху, варухнуў вуснамі, абвёў вачыма ўсю грамаду і спытаў:

— А дзе кавалеры?

— Сёння няма, дзедку, — адказала Каця. — У гэты вечар мы хацелі пабыць самі.

— Ага, ну то і даволі гэтага хіхатання. Расхадзеўш!

Дзяўчаты баяліся Кацінага дзеда. Надта ж крыклівы ён быў. Але не змаглі стрымацца ад смеху з гэтага „расхадзеўша". Дзед, аднак, пагрозліва насупіў бровы і не сунімаўся:

— Такія тут дзеўкі! Людзі ноч разбяруць, а яны сядзяць і смешкамі забаўляюцца.

— Дзедку, то ж сёння святы вечар — шчадруха, — баранілася Каця. — Трэба ж пасядзець даўжэй.

— А была каўбаса на вячэру? — спытаўся дзед, ужо крыху паспакайнеўшы.

— Была-была, то ж вы цэлую адностальку з'елі. Забыліся, ці што? — упэўніла яго ўнучка.

— Ну, пайду на двор, — сказаў дзед і пачаў апранаць свой кажушок.

Дзяўчаты таксама пачалі збірацца дахаты. Ведалі яны, што калі дзед вернецца з абходу свайго падворка, то і так іх разгоніць.

Выйшлі гурбою ў вароты. А там не прайсці: у самых веснічках стаяў вялізны балван. Ён быў утырканы кійкамі, мяцёлкаю, на галаве меў цэбрык, нос — вялізная морква.

— Вось, жулікі! Што вычварылі. Як мы павыходзім? — занепакоіліся дзяўчаты.

Падышоў дзед Марка.

— Во, праз гэтае ваша зборышча што нарабілі хлопцы! Ну, перапёлачкі, бераце калкі ды разбівайце.

Дзед крануў кіем балвана і заўважыў:

— Ухітрыліся — вадою палілі, каб умацаваўся. А на галаве цэбрык не мой. Здаецца, у Тэклі сцягнулі. Бач, не прыхавала...

Дзяўчаты, разбіўшы балвана, паразыходзіліся па хатах.

Каця, вярнуўшыся дадому, пачала рыхтавацца да сну. Дзядуля абыходзіў сядзібу і пільна глядзеў, ці яшчэ чаго не ўпаролі хлопцы.

— Бабулю, — азвалася Каця, — кладзіцеся і вы. Ужо позна.

— Лягу, Каценька, лягу, — падала голас бабуля. — Няхай адно дзед прывалачэцца.

Яна чакала, пакуль засне Каця, бо абавязкова хацела непрыкметна паставіць пад ложак міску з вадою ды з дзвюма драначкамі: нібыта рэчку з мосцікам. А вось прысніцца Каці, хто яе праз гэты мосцік праводзіць будзе. З усіх варожбаў гэтую, з мосцікам, яна прызнавала найпраўдзіўшай. Гэтак выварожыла бабулька сабе свайго Марка сорак пяць гадоў таму назад.

Шчодры вечар калядак

Адзінаццаты раз адбылася прэзентацыя калядных калектываў „Гвязда і калядка". 10 студзеня 2010 г. а 14 гадзіне раскрыліся дзверы Гарнізоннага клуба ў Беластоку, вядомага ўсім аматарам беларускай песні. Мерапрыемства, фінансава падтрыманае Міністэрствам унутраных спраў і адміністрацыі, Маршалкоўскай ваяводскай управай і Культурным цэнтрам Беларусі, сабрала каля 500 выканаўцаў ды паўнюткую залу гледачоў. Выступілі маладыя і старэйшыя ўдзельнікі калектываў, вядомых з іншых беларускіх свят: ад дашкольнікаў і настаўніц садка № 14 ды школьнікаў з „чацвёркі" ў Беластоку ды „Жэўжыкаў" з бельскай „тройкі" і маладзенькіх самадзейнікаў Веры Масайлы са „Званкоў" з ГДК у Гайнаўцы, „Вэрвачкі" з Орлі, „Зараначкі" з Ласінкі — да „Васілёчкаў" і „Курантаў" з Бельска, „Рэха пушчы" з Гайнаўкі, „Крыніцы" ды „Каласкоў" з Беластока, з „Чыжавянамі", ляўкоўскімі „Цаглінкамі", „Збучанкамі", „Арлянамі", „Малінкамі", „Арэшкамі", козліцкай „Рэчанькай", раенскімі „Згоднымі макамі" ды „Калінай" з Залук ды гарадоцкімі „Асеннім лістом" ды „Хутарам" і „Расспяваным Гарадком"... Былі і новыя — „Сугучча" з Крынак, „Луна" з Парцава і Беластока. З прыгожымі гвяздамі ўрачыста хвалілі яны Нараджэнне Збавіцеля ў калядках вядомых і старажытных, як доўгае хвалапенне ў пару дзесятак строф, якое заспявалі „Збучанкі".

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Садок № 14 з Беластока

„Сугучча" з Крынак

„Васілёчкі" з Бельска-Падляшскага

„Званкі" з ГДК у Гайнаўцы

„Рэха пушчы" з Гайнаўкі

„Жэўжыкі" з бельскай „тройкі"

„Згодныя макі" з Райска

„Жэмэрва" са Студзіводаў

„Чыжавяне" з Чыжоў

„Хутар" з Гарадка

Рэзюмэ даклада прафесара Яўгена Мірановіча, зачытанага 26 лістапада 2009 года на навуковай канферэнцыі „Рэлігійныя перамены на Беларусі"

Змаганне за вернікаў паміж Праваслаўнай, Каталіцкай і Уніяцкай цэрквамі сярод беларускага насельніцтва Польшчы ў міжваенны перыяд

Змаганне за душы насельніцтва Беларусі вялося даволі інтэнсіўна яшчэ з часу Крэўскай уніі. Толькі ў адрозненні ад змагання за вернікаў, якое адбывалася па ўсёй Еўропе, дзе дамінавала перш за ўсё змаганне за ідэю, тут, на Беларусі, заўсёды вырашальным фактарам былі нейкія інтарэсы. Для тых ці іншых інтарэсаў людзі мянялі веравызнанне. Пасля, калі мянялася ўлада, мяняліся і інтарэсы і запар



з імі мяняўся і вектар канверсіі. У Рэчы Паспалітай дзяржава спрыяла пераходу натоўпаў ва ўніяцтва, пасля змены дзяржаўнасці на беларускіх землях і ўстанаўлення расійскай улады натоўпы вярнуліся ў праваслаўе; сіла дзяржавы была вырашальным фактарам канверсіі. Характэрна тут тое, што не захаваліся ніякія сляды масавай абароны сваёй рэлігіі. І ў XVI, і ў XVII стагоддзях няма ніякага супрацьстаяння праваслаўных пераходу ва ўніяцтва, накшталт супрацьстаяння, якое было, для прыкладу, у Нямеччыне ў час рэлігійных канфліктаў. Таксама, калі царскія ўлады загадалі ўніятам вярнуцца ў праваслаўе, былі толькі інцыдэнты супраціўлення, але нейкай масавай дэтэрмінацыі не было. Можна сказаць, што з боку жыхароў Беларусі абыякавасць да веравызнання была з'явай характэрнай.

Пасля першай сусветнай вайны змаганне за душы гэтага абыякавага да веравызнання грамадства стала больш інтэнсіўным. Тая інтэнсіўнасць была вынікам змен, што адбыліся ў Расіі. Пасля бальшавіцкага перавароту тыя змены Ватыкан асэнсаваў як нагоду для пашырэння каталіцкай місіі. Бальшавікі, калі яны ў 1918 годзе шукалі падтрымкі, стварылі такую надзею, што калі замацуюцца, то адкрыюць межы Расіі для ўсіх акцый Каталіцкай царквы. У Ватыкане пачалася вялікая падрыхтоўка манахаў італьянскага, нямецкага ці французскага паходжання, пачалі іх навучаць рускай мове ды царкоўна-літургічнага парадку дзеля будучай місіянерскай працы ў Расіі. Мінулі гады, Ватыкан выпускаў чарговых спецыялістаў па працы з праваслаўным рускім народам і трэба было неяк выкарыстаць тыя іх веды. Для гэтага найбольш спрыяльныя ўмовы былі ва ўсходніх ваяводствах Рэчы Паспалітай. Таму ўжо ў пачатку 1920-х гадоў у межах Польшчы апынулася шмат гэтакіх місіянераў; розныя крыніцы ацэньваюць іх лік ад некалькіх дзесяткаў да некалькіх соцень чалавек. У Ватыкане была створана спецыяльная кангрэгацыя Pro Russia, якая мела арганізаваць місійную дзейнасць на Усходзе. Але спачатку трэба было даць заняткі гэтым місіянерам дзесьці на тэрыторыі Польшчы. Каардынатарам місіі ў Польшчы быў у 1923 годзе назначаны падляшскі біскуп Генрых Пшаздзецкі.

Ідэя была такая, каб тым манахам, якія прыедуць у Польшчу, знайсці месца сярод праваслаўнага насельніцтва. Таму яны вонкава ўпадабняліся да праваслаўных святароў, апраналіся на праваслаўны лад, насілі бароды — каб лепш успрымацца праваслаўным насельніцтвам. З другога боку вялася таксама акцыя пераконвання некаторых праваслаўных святароў, якія былі ў канфлікце са сваім асяроддзем, і калі яны прыходзілі да каталіцкіх епіскапаў, іх прымалі — з думкай выкарыстання іх для будучай місійнай дзейнасці.

У пачатку 1920-х гадоў на тэрыторыі Заходняй Беларусі паўстаў хаос. Некаторыя святары не вярнуліся з бежанства, некаторыя вярнуліся, але ім закідалі, што яны актыўна падтрымлівалі палітыку русіфікацыі, улады стараліся іх адсунуць, каб яны не вярнуліся на свае месцы. Дзяржава стала на курс асіміляцыі мясцовага насельніцтва ў польскую культуру. І вось яна намагалася прызначаць тых святароў, якія былі схільныя да супрацоўніцтва з каталіцкай іерархіяй. Пераходным момантам стаў пераход архімандрыта Філіпа Марозава ў рады каталіцкага духавенства. У 1926 годзе Марозаў атрымаў магчымасць сустрэцца з папам рымскім, і пасля ў Вільні ён саслужыў сваю першую каталіцкую багаслужбу. Характэрна тое, што Марозаў у касцёле звяртаўся да каталіцкіх расіян, якіх там зусім не было. Захаваліся паліцэйскія запісы ягонага казання; м.інш. ён гаварыў: „У будучыні, Расія, калі захоча стаць здаровай фізічна і духоўна, павінна стаць каталіцкай, а Польшча, якая здаровая фізічна і духоўна, павінна Расіі дапамагчы, як сваёй сястры, якая цяпер хворая. І так, у Вільні ўзнікае славянскі касцёл, які арганізуюць каталікі-расіяне, і пры падтрымцы польскага ўрада, польскіх біскупаў, польскага грамадства, гэтая царква будзе авангардам будучай каталіцкай Расіі. І калі Каталіцкая царква замацуецца ў Расіі, яна будзе аб'ядноўваць два братнія народы: палякаў і расіян".

Планы акаталічання Расіі Марозавым былі абыякава ўспрыняты прабываючымі ў Рэчы Паспалітай расійцамі. Таму ён у канцы 1927 года стаў выступаць ад імя беларусаў, патрабуючы, каб беларускія каталікі мелі свае правы ў Касцёле, каб яны там карысталіся беларускай мовай. Гэтага было зашмат і яго ў пачатку 1928 года некуды адаслалі; ён жа хацеў акаталічваць каталікаў, якія каталікамі ўжо былі.

Іншым святаром, які пасля прыходу на арцыбіскупскую кафедру Рамуальда Ялбжыкоўскага паехаў да яго і запрапанаваў, што ён і ягоная парафія пераходзяць пад амафор віленскага арцыбіскупа, быў Уладзімір Леснагродскі з мясцовасці Паставы. Ён назбіраў нейкіх подпісаў і заявіў арцыбіскупу, што большасць ягоных прыхаджан пераходзіць у каталіцтва. Ялбжыкоўскі, які толькі што ўступіў у сан, успрыняў гэтую заяву з энтузіязмам. Леснагродскі дадаў, што шмат схізматыкаў хацела б вярнуцца да сапраўднай веры і выказаў упэўненасць, што яны ўсе прыйдуць у каталіцтва і Царква стане каталіцкай. Біскуп папрасіў Леснагродскага паспрыяць скарэйшаму такому пераходу Царквы. Ялбжыкоўскі напісаў міністру веравызнанняў і адукацыі, каб царкву ў Паставах перадаць каталікам, бо там ужо амаль усе прынялі каталіцызм. Міністр паслаў службовы загад, каб яго падуладныя праверылі сітуацыю ў Паставах, і пасля адпісаў арцыбіскупу, што якія-небудзь кантакты з Леснагродскім будуць кампраметаваць яго самога. Удакладніў ён, што Леснагродскага выкінулі з Праваслаўнай царквы і ніхто з вернікаў прыхода не стаў каталікам.

Асаблівае спаборніцтва за вернікаў адбывалася на Палессі. Вернікі ў парафіях Лунінецкага павета некалькі разоў мянялі веравызнанне. У вёсцы Мілевічы з'явіўся ксёндз Шымкевіч і пераканаў людзей, каб яны перайшлі ў каталіцкі касцёл. І напісаў пінскаму біскупу, што ўсе прыхаджане падпісаліся прыняць каталіцкае веравызнанне. Але праз нейкі час прыехаў у вёску пасланец праваслаўнага епіскапа з Пінска, Уладзімір Шыманоўскі, і перад царквой — бо царква была ўжо закрыта — адправіў набажэнства, сказаў пропаведзь ды запытаў прысутных пра іх веравызнанне; яны назваліся і падпісаліся... праваслаўнымі.

Цікавая сітуацыя ўзнікала, калі з Ватыкана прысылалі згаданых барадатых ксяндзоў, якім найчасцей давалі пост вікарнага каталіцкай парафіі. У шматлікіх лістах, адрасаваных так епіскапам, як і адміністрацыйным уладам, былі пратэсты супраць назначанню тых „праваслаўных папоў". Людзі не ведалі ў чым справа — прыехаў нейкі „рускі" святар, які да людзей звяртаецца па-руску (яны ж польскай мовы не ведалі, толькі вывучалі рускую); абурэнне было вялікае. І шматлікія каталіцкія святары вельмі рашуча выступалі супраць гэтай неакаталіцкай місіі. Ксёндз канонік Юзаф Бародзіч выйшаў з такой тэорыяй, што гэтыя барадатыя пасланцы з Ватыкана прыбылі ў выніку нямецкай інтрыгі, каб знішчыць польскія Крэсы. Ён далей дайшоў да вываду, што нямецкімі агентамі з'яўляюцца таксама ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі, які разам з Браніславам Тарашкевічам і Пятром Мятлою задумваюць рэвалюцыю на Крэсах. Такой думкі прытрымліваліся таксама некаторыя каталіцкія дзеячы ва ўсходніх ваяводствах.

У 1927 годзе ў Каталіцкі касцёл усходняга абраду ў Палескім ваяводстве перайшло — пасля актыўнай дзейнасці — 2300 вернікаў. У той час праваслаўных там было каля 920 тысяч, а каталікоў амаль сто тысяч. Відаць, што вынік тых намаганняў быў мізэрны, хаця на гэта былі прызначаны вялікія сродкі. Гэта паказвае, як абыякава людзі адносіліся да ўсялякіх прапаноў змены веравызнання. З другога боку былі дзяржаўныя ўлады, якія стараліся асіміляваць насельніцтва ў польскую культуру. Тыя манахі, што былі прысланы Ватыканам, працавалі на расійскай мове, а ўладам жа ішло пра тое, каб касцёлы прыцягвалі да польскай мовы, а не пра мацаванне расійскіх уплываў. Таму з канца 1920-х гадоў ула-

ды сталі рашуча выступаць супраць усялякіх уніяцкіх і неаўніяцкіх місіяў, арганізаваных Ватыканам, называючы іх антыпольскай агентурай.

Паколькі гэтая місійная акцыя не дала станоўчых вынікаў, у Ватыкане ў пачатку 1930-х гадоў

працяг ☞ 10

9 ☞працяг

Змаганне за вернікаў паміж ...

рашылі пайсці з місіямі на беларускай і ўкраінскай мовах. І місіянераў, якія выводзіліся з Польшчы, вучылі гэтым мовам. Прычына гэтага была такая, што на Валыні і Палессі, не гаворачы ўжо пра Галіччыну, рускамоўным місіям супрацьстаялі ўкраінскія дзеячы; пратэставалі таксама беларусы. Але нават шырэйшае выкарыстоўванне беларускай і ўкраінскай моў не паспрыяла пераходу ў каталіцтва.

Найбольшыя поспехі місіі былі дасягнуты ў 1927 годзе, калі налічвалася 14 неаўніяцкіх парафій з дваццаццю тысячамі вернікаў. Пазнейшыя справаздачы інфармуюць, што колькасць парафіяў узрастала: у 1937 годзе былі 42 парафіі, але вернікаў у іх было ўжо толькі чатырнаццаць тысяч. У сапраўднасці ніхто не ведаў, колькі налічвалася тых вернікаў.

ALBERTYN. — Ołtarz w cerkwi z obrazem zaołtarzowym.

У 1930 годзе Міністэрства замежных спраў, якое рыхтавалася да рашучай размовы з Ватыканам на тэму неаўнійнай акцыі, паспрабавала даведацца, колькі вернікаў ёсць у кожным усходнім ваяводстве і паслала ў тыя ваяводствы запытанні на гэты конт. З Вільні прыйшоў адказ, што на тэрыторыі Віленскага ваяводства ёсць 600-700 вернікаў, якія раней былі праваслаўнымі, а цяпер, магчыма, канвертаваліся ва ўніятаў — магчыма! У дзвюх парафіях, дзе служаць езуіты, праўдападобна так ёсць. У іншых шасці парафіях пробашчы заяўляюць, што ў іх католікі, але вернікі не надта арыентуюцца ў сваім веравызнанні. З Беластоцкага ваяводства прыйшоў адказ, што тут каля дзвюх тысяч двухсот чалавек можна лічыць уніятамі; яны былі ў парафіях у Курашаве, Фастах, Коснай і Зальвянах.

Цікавымі былі таксама вынікі апытання пра нацыянальнасць тых уніятаў. У Фастах большасць адказала, што яны рускія, а ў Курашаве, Коснай і Зальвянах — што беларусы. І ўрад вырашыў, што гэтая акцыя не дае чаканых паланізацыйных вынікаў і не можа далей яе падтрымліваць. Аднак Ватыкан не адступаў ад сваёй місіі і ў Пінску была наладжана вялікая канферэнцыя ўніяцкага святарства, якая прыняла пастановы, што праваслаўных трэба прыцягваць да каталіцтва ўсялякімі спосабамі. Было сказана, што псіхалогія праваслаўных іншая чым католікаў і таму неаўніяцкія місіянеры павінны паказваць адданасць рускім, хваліць рускую культуру, рускую гісторыю, усё, што рускае. Было таксама пытанне, ці новых вернікаў называць католікамі; выснова была такая, што трэба захаваць назву праваслаўных, бо важная не форма навучання, толькі яго змест, што трэба пераконваць людзей у важнасці каталіцкіх іерархаў, якія трымаюць блізкі кантакт з Богам, тлумачыць, што папа важнейшы за варшаўскага мітрапаліта.

Змена веравызнання наступала найчасцей у час мешаных шлюбаў, дзе выступаў асабісты інтарэс для такой змены. Канверсійная агітацыя не давала вынікаў. У 1930-х гадах Праваслаўная царква рашыла бараніцца супраць каталіцкай місіянерскай акцыі — у саюзе з дзяржаўнай адміністрацыяй. Ладзіліся канферэнцыі, для прыкладу брацтва Гродзенскай епархіі, дзе ўзамен за прыхільнасць дзяржавы праваслаўныя дэлегаты абавязваліся дзейнічаць і выхоўваць прыхаджан у духу паслухмянасці дзяржаўным уладам. Панегірыкі, якія пісалі праваслаўныя пасля смерці Пілсудскага ў 1935 годзе, можна прымяркоўваць да панегірыкаў Сталіну ў СССР. Аднак саюзнік, якога абрала сабе Праваслаўная царква, аказаўся маланадзейным. У 1938 годзе польскія ўлады рашылі зрабіць Царкву інструментам паланізацыі. Там, дзе можна было зрабіць царкву польскай царквой, там гэта рабілі — гэта адбывалася на беларускім арэале. Там, дзе гэта немагчыма было зрабіць, пачалі цэрквы ліквідаваць — на Холмшчыне і Валыні. Дзяржаўныя ўлады падрыхтавалі новую адміністрацыйную структуру Царквы, якая мела быць уведзена ў 1940 годзе. Мелі быць створаны 12 епархій, на якія мелі ўступіць паслухмяныя епіскапы. У 1939 годзе быў надрукаваны праваслаўны каляндар на рускай мове, той каляндар па загадзе ўлад быў спынены, усё мела быць па-польску. У тым жа 1939 годзе быў надрукаваны зборнік казанняў для праваслаўных святароў у выглядзе канспекта з распісаннем на паасобныя святы; святары мелі яго завучыць на памяць. Эксперымент быў сарваны вайной і цяжка сказаць, якая была б рэакцыя вернікаў у адказ на яго.

Быў вялікі ціск, каб на дзяржаўную працу, у тым ліку і ў школы, прымаць толькі палякаў. У 1938 годзе палескі ваявода загадаў праверыць настаўнікаў, якія дэкларавaліся праваслаўнымі палякамі, на якой мове яны размаўляюць дома. Бо калі яны палякі, то абавязаны размаўляць з суседзямі і сямейнікамі на польскай мове, павінны быць гэтай мовы місіянерамі. І калі настаўнік не праводзіў дзяржаўнай місіі пашырання польскай культуры, яго трэба было пазбыцца з працы; былі такія выпадкі. У Навагрудскім ваяводстве ў 1938 годзе большасць дзяржаўных чыноўнікаў праваслаўнага веравызнання перайшла на каталіцызм, дзеля выжывання. З 1935 года стала складана ўладкавацца на дзяржаўную працу асобам, якія ў сваіх сем'ях мелі асобы некаталіцкага веравызнання. У 1938 годзе Міністэрства ўнутраных спраў рэкамендавала не прымаць на працу асоб некаталіцкага веравызнання нават прыватным асобам!

Апрацаваў Аляксандр ВЯРБІЦКІ



Імя мастака Марка Шагала добра вядомае на абшарах Еўропы. Беларусам мусіць быць вельмі прыемна, што ягоная творчасць непарыўна звязана з Віцебскам — вялікім горадам на паўночным усходзе Беларусі, што стаіць на берагах Заходняй Дзвіны, дзе калісьці ў яўрэйскай сям'і і нарадзіўся будучы слынны майстар пэндзля.

Дзеля справядлівасці варта адзначыць, што не толькі Шагал прынёс Віцебску мастацкую славу — у горадзе і яго наваколлях знаходзяцца разнастайныя музеі, экспазіцыі якіх даюць падставы называць гэты горад адным з галоўных культурных цэнтраў Беларусі. Каб у гэтым упэўніцца, дастаткова зазірнуць на сайт, які носіць назву „Віцебскі абласны краязнаўчы музей" і месціцца ў інтэрнэце па адрасе **http://ratusha.by.**

Першая старонка сайта, выкананая ў бела-балкітных танах, адразу натхняе на нейкі летуценны настрой. Сілуэты будынкаў і выявы вулічных ліхтароў нібыта падказваюць, што мы знаходзімся ў месцы, дзе прыгажосць і чароўныя ўспаміны больш важныя за ўсё астатняе.

Выйсці да розных рубрык сайта месцяцца як з правага боку, так і зверху выяўлення. Паколькі Віцебскі краязнаўчы музей мае некалькі філіялаў, якія па сутнасці з'яўляюцца самастойнымі музеямі, то кожнаму з іх вызначана асобная старонка.

Калі ж кранацца выключна краязнаўчага музея, то аб ім вельмі падрабязна распавядаецца ў рубрыцы „Гісторыя". „Гісторыя музея пачынаецца яшчэ з дарэвалюцыйных часоў, калі ў Віцебску дзейнічала некалькі музеяў, калекцыі якіх і сталі ў далейшым асновай фондаў краязнаўчага музея", — гаворыцца ў „гістарычным" расповедзе, які ў рэшце рэшт даводзіць нас да цяперашніх дзён.

Даведацца аб экспазіцыі музея дазваляе аднайменная рубрыка. Да сталых выстаў, па ўсім відаць, адносяцца „Старажытны Віцебск" і дзве экспазіцыі, прысвечаныя змагарам часоў Другой сусветнай вайны.

Рубрыка „Галерэі" змяшчае паведамленні і расповеды аб адкрыцці часовых экспазіцый. Згодна інфармацыі на дадзенай старонцы цягам года ў музеі можна пабачыць ад пяці да дзесяці новых выстаў.

На старонцы „Калекцыі" гаворка ідзе аб разнастайных тэматычна сабраных экспанатах, якія захоўваюцца у краязнаўчым музеі, што месціцца ў будынку былой гарадской ратушы.

Каб віртуальна зазірнуць у філіялы музея, а імі з'яўляюцца Літаратурны музей, Мастацкі музей, Музей прыватных калекцый і Музей-сядзіба Ільі Рэпіна, то трэба клікнуць мышкай на адну з аднайменных рубрык сайта, што месцяцца з правага боку агульнага выяўлення.

Галоўная задача Літаратурнага музея заключаецца ў тым, каб распавесці аб асветніках, пісьменніках, якія нарадзіліся на Віцебшчыне альбо звязаныя з ёй лёсам.

У зборы Мастацкага музея — калекцыі графікі, станковага алейнага жывапісу, тэмпернага жывапісу, скульптуры і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Музей прыватных калекцый быў створаны на аснове прыватнага збору віцебскага калекцыянера Івана Галькевіча, усе экспанаты з якога былі перададзены дзяржаве ўдавой калекцыянера. Наведвальнікі ўбачаць там мноства манет, медалёў розных краін свету, а таксама іншыя рэчы.

Музей-сядзіба Ільі Рэпіна — знанага рускага мастака, знаходзіцца ў 16 км ад Віцебска ў вёсцы Здраўнёва. Там месціцца калекцыя, што распавядае аб жыцці і творчасці мастака ў тых месцах.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Збольшага па-ранейшаму

Новы біятлонны сезон пачаўся для беларускіх прадстаўнікоў не так кепска, як праходзіў мінулы, але нагоды для вялікага аптымізму таксама няма. Да такой высновы прыводзяць вынікі зборнай на трох мінулых этапах Кубка свету. Хоць ужо стартавы этап у шведскім Эстэрсундзе, нават першая гонка прынесла беларускай зборнай медаль. У індывідуальнай гонцы на 15 км Дар'я Домрачава ўзышла на трэцюю прыступку п'едэстала. Прытым, праўда, чарговы раз трапіла ў недарэчную гісторыю, стрэліўшы адзін раз памылкова ў чужую мішэнь. Такія казусы нярэдкія ў Домрачавай. Людміла Ананька, Вольга Кудрашова, Людміла Калінчык на этапах у Швецыі, Аўстрыі і Славеніі паказалі досыць пасрэдныя вынікі. Адсюль і невысокія для Беларусі месцы ў эстафетах: на першым этапе — 9-е, на другім — 10-е. А да алімпіяды застаецца не так шмат часу. У аўстрыйскім Хохфільцэне істотна „паправіла прыцэл" Надзея Скардзіна, дасягнуўшая ў спрынце 12-га месца, услед фінішавала Ананька. Домрачава выявіла нестабільную стральбу. У славенскім горадзе Паклюка на трэцім этапе крыху абнадзеіла Вольга Назарава — у гонцы на 15 км яна страляла абсалютна дакладна, у выніку ж пры маруднай хадзе на лыжах — 14-ы радок у пратаколе. Домрачава была зноў блізка да п'едэстала ў спрынце — 4-е месца.

У мужчын збольшага ўсё па-ранейшаму. Сяргей Новікаў звыкла трапна страляе і калі бездакорны ў гэтым кампаненце, то перыядычна ўваходзіць у дваццатку-трыццатку мацнейшых. Аднак, яго хуткасць не дазваляе нават тэарэтычна разлічваць на месца ў тройцы мацнейшых. Лепшыя гады Аляксандра Сымана і Рустама Валіуліна праўдападобна засталіся ў гісторыі. Цяперашняя іх крайне няўдалая стральба не дазваляе спадзявацца на высокія месцы. Той жа Валіулін бяжыць досыць хутка (11-е месца пры двух промахах у спрынце на аўстрыйскім этапе таму доказам), але гэтага замала. З'явіўся, праўда, і промень святла ў асобе маладога Яўгена Абраменкі. У Паклюцы ў гонцы на 20 км ён паказаў свой лепшы вынік у кароткай яшчэ кар'еры — 19-е месца. Эстафетныя паказчыкі ў мужчын наступныя: Эстэрсунд — 10-е, Хохфільцэн — 11-е. Эстафеты ў Паклюцы не праводзіліся.

Што датычыць агульнай сітуацыі ў сусветным біятлоне, то варта адзначыць прагрэс амерыканцаў. Так, лідарам сезона ў агульным заліку сярод мужчын зараз з'яўляецца Цім Бурк. Другім ідзе пакуль француз Сімон Фуркад, трэцім аўстрыец Крыстоф Зуман. Дзеля справядлівасці адзначым, што грозныя нарвежцы Эміль-Хэгле Свендсан і Уле-Айнар Б'ёрндален прапускалі пераднавагодні этап. У галоўных фаварытаў, па ўсім відаць, свая стратэгія на сезон. Пасля допінгавых скандалаў паменела поспехаў у расійскіх прадстаўнікоў. Лепшы з беларусаў — Новікаў, у яго 19-я пазіцыя. А найбольш са знакам мінус здзіўляюць пакуль немкі, для якіх пачатак сезона выдаўся горшым у гісторыі. Ды штосьці інтуітыўна падказвае, што нямецкія біятланісткі, тыя ж Магдалена Нойнэр і Каці Вільхельм, у якіх ужо „прабіліся" высокія вынікі, яшчэ возьмуць сваё. У жанчын пакуль наперадзе дзве шведкі — Хелена Юнсан і Анна-Карын Олафсан-Зідэк, на трэцім месцы Святлана Сляпцова з Расіі. Наша Домрачава на 6-ым радку, Скардзіна — на 18-ым. Аднак, сапраўдным паказчыкам класа і роўню можа быць толькі алімпіяда, якая і выявіць сапраўдных лідараў і чэмпіёнаў.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Мае ўражанні ад З'езду

XVI З'езд БГКТ, які адбыўся 20 снежня 2009 г. у Беластоку, гэта важная падзея. На ім абмяркоўваліся справы беларускай нацыянальнай меншасці, якімі займалася Беларускае грамадска-культурнае таварыства ў 2006-2009 гадах. У сваёй справаздачы старшыня ГП БГКТ Янка Сычэўскі шырока распавёў дэлегатам і гасцям з'езда пра ўсе формы дзейнасці ў сферы культуры і мастацтва, пра конкурсы, фэстыны і г.д. Старшыня вельмі рэзка прадставіў адмоўнае стаўленне да БГКТ іншых беларускіх арганізацый, якія дзейнічаюць у Польшчы, прытым моцна пакрытыкаваў іх прадстаўнікоў, напрыклад, Яўгена Вапу, Алега Латышонка, Радаслава Дамброўскага, а таксама крытычна аднёсся да Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі. Праехаўся вельмі востра па сродках масавай інфармацыі, у тым ліку і нашых, беларускіх. Папала таксама і журналістам „Нівы". З пункту гледжання Я. Сычэўскага ўсе наваліліся на яго, душаць, знішчаюць і што там яшчэ... Але гледзячы на ўсе вынесеныя ў справаздачы абвінавачанні ў адрас г.зв. „негадзяяў" варта было б, каб і сам старшыня аглянуўся на свае заднія калёсы і заўважыў, якія ў яго дзейнасці былі недахопы, правалы...

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Шукаючы ісціны „разгрому беларускай культуры", бо такія словы прагучалі ў справаздачы, звярнуўся я да літаратараў-„белавежцаў" з просьбай выказаць сваё меркаванне на гэтую справу.

Міра Лукша: Мяне, як паэтку, дзеяча на беларускай літаратурнай ніве, ГП БГКТ на свае мерапрыемствы не запрашае, а таксама не запрашае як журналістку „Нівы". Вельмі шкада. Не ведаю чаму і навошта БГКТ гэта патрэбнае.

Янка Целушэцкі: Мне ўсё ясна. Не хацелі, таму на з'езд не запрасілі. Прыкра мне, бо калісьці быў я ў праўленні БГКТ у Беластоку. Відаць я, як і многія іншыя дзеячы, у цяперашняга кіраўніцтва не заслугоўваю гэтага. І хай сабе... І так бывае...

Віктар Швед: Я чакаў, што мяне запросяць на XVI З'езд БГКТ, паколькі я быў сярод яго першых членаў, стваральнікаў, арганізатараў, ад самога пачатку выконваў важнейшыя функцыі, аддаў многа здароўя для сваёй нацыі. А тут вось што ўзамен...

У далейшай размове Віктар Швед сказаў, што свайго часу сакратар ГП БГКТ Валянціна Ласкевіч папракнула паэта: „Ты не наш, ты ўжо ніваўскі". Паэт адказаў на гэта: „Я нічый — я з'яўляюся самім сабою і такім застаюся".

Кіраўнікі БГКТ не запрасілі таксама шматгадовага дзеяча і былога старшыню гэтай арганізацыі прафесара Аляксандра Баршчэўскага, паэта, які на працягу дзесяцігоддзяў укладаў душу, здароўе ў беларушчыну. Велізарных заслуг для беларускай справы не адбярэ яму ніхто, нават і сённяшні старшыня Янка Сычэўскі.

БГКТ не запрашае на свае мерапрыемствы і Анастасіі Майсені — удавы па Кастусю Майсеню, які ўсё сваё жыццё прысвяціў беларускасці на Беласточчыне. Чаму так? З боку БГКТ — маўчок.

На маю думку прысутнасць на з'ездзе літаратараў, якія як ніхто іншы адчуваюць голас і патрабаванні часу, заслужаных для БГКТ дзеячаў неабходная. Яны могуць злучаць ніці ўзаемаразумення паміж намі, беларусамі, тут, на Беласточчыне. Толькі пры супрацоўніцтве мы зможам згуртаваць нашае асяроддзе.

Абвастрэнне супрацьстаяння БГКТ і іншых беларускіх арганізацый выклікае трывогу і занепакоенасць. Цяперашняя сітуацыя складаная як ніколі раней. Агрэсія выклікае агрэсію, кожны яд знаходзіць процідзе. І аб гэтым трэба помніць у сваіх выказваннях нават вопытнаму Янку Сычэўскаму. Такія красамоўныя дзеячы становяцца сіротамі. Гэта наша агульная бяда. Але самае галоўнае ў гэтай бялючай праблеме, на мой погляд, гэта тое, што пачалі мяняцца адносіны грамадства да сіроцтва красамоўных беларускіх чыноўнікаў. Трэба, каб завадатары беларускіх спраў прынялі актыўны ўдзел у мерапрыемстве, якое можна назваць „круглым сталом", у ходзе якога абмяркоўваліся б справы культуры, асветы, таго, як захаваць духоўны свет сённяшняму і будучым пакаленням.

Віктар БУРА

Новы расклад язды

Штогод адмяняецца расклад язды на чыгунцы. Апошні, уведзены 13 снежня 2009 года, будзе абавязваць да 11 снежня 2010 года. У выніку гэтай змены знікне з карты Падляшша чарговых трыццаць шэсць нерэнтабельных цягнікоў, прычым прадбачваецца увальненне з працы сямідзесяці працаўнікоў Прадпрыемства рэгіянальнай перавозкі. На лініі Чаромха — Беласток некалькі аптымістычных навінак. Асноўнай з'яўляецца такая, што патэнцыяльныя пасажыры маюць забяспечанае штодзённае спалучэнне са сталіцай рэгіёна як у будзённыя дні, так і ў суботы і святочныя дні. Вось як курсіруюць зараз цягнікі на гэтай лініі: →

Варта адзначыць, што на згаданай лініі не толькі скароціўся час падарожжа з трох гадзін да 1,40 гадз., але і павысіўся камфорт язды. Адышлі ў нябыт маленькія рэйкавыя аўтобусы без туалетаў, а іх месца занялі прасторныя, абсталяваны суперсучаснай тэхнікай цягнікі з кандыцыянерамі. Як паведамляе Прадпрыемства рэгіянальнай перавозкі, ад 1 сакавіка прадбачваецца зніжэнне кошту аднаразовага білета (зонавага) з Беластока ў Бельск-Падляшскі і Чаромху на тры злоты. Няўжо ж гэта прыманка дзеля прыцягнення колькасці пасажыраў? Калі так, дык на маю думку, гэта важная здзелка ў рыначнай эканоміцы.

Уладзімір СІДАРУК

НАШЫ карэспандэнты

Ад'езды з Беластока:	у Бельску	у Чаромсе	
6,46	7,39	8,17	курсіруе ад панядзелка да суботы.
7,24	8,21	9,00	у нядзелі
14,27	15,25	16,03	штодзень
16,13	17,06	17,44	штодзень
18,10	19,03	19,41	ад панядзелка да пятніцы і ў нядзелю (апрача суботы)

Ад'езды з Чаромхі:	у Бельску	Беласток	
4,45	5,24	6,17	ад панядзелка да суботы
5,40	6,18	7,19	штодзень
6,58	7,41	8,35	ад панядзелка да пятніцы (апрача свят)
9,18	9,55	10,48	суботы, нядзелі і святочныя дні
14,09	14,46	15,39	штодзень

Адгаданка

1. каманда ў караблі, самалёце, танку, 2. плод яблыні, 3. пецярбургская рака, 4. сцёблы злакавых раслін пасля абмалоту, 5. шосты гук музычнай гамы, 6. снарад Надзеі Астапчук і Надзеі Міхневіч, 7. літаратурны жанр для сцэны, 8. ровар, 9. „арка" над хамутом, 10. эфіраносная расліна з моцным пахам і горкім смакам (*Artemisia absinthium*).

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — партугальская пагаворка.

						1			
		2		3					
			4	5		6	7		
8			9					10	

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 50 нумара

Баку, іней, Рым, сюіта, цукар, Чылі, чэк.

Рашэнне: **Не кліч сабакі, трымаючы кій у руцэ.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Лявону Федаруку** з Рыбал.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.

Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 250 egz.

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Ганна КАНДРАЦЮК

Дзядоўскае турнэ з Анатолем С. (8)

Валя Алейнікава і Міра Лукша ля брамы могілак

— Я і сам напісаў, што Анатоль не памёр, што ён прытварыўся. Нават калі стаіш пры яго помніку на могілках у Гарошкаве, не верыцца што ён там, у зямлі, — разважае Сяргей Сыс. Заўвага паэта, родам з суседняй Заспы, аж просіцца ў нашу дзядоўскую хроніку цудаў. Сяргей — першы ў свеце, хто не павінен сумнявацца. Пяць хвілін да таго як закапаць цела Анатоля Сыса ў зямлю менавіта яму загадаюць адкрыць накрыўку дамавіны, каб праверыць...

* * *

Адразу пасля прыезду ў Гарошкаў, разам з сястрой Валянцінай мы адправіліся на вясковы могільнік, каб навесці парадкі на магілах сям'і Сысаў. Згодна сучаснай модзе і выгодзе на могілкі заехалі мы на рэйсавай маршрутцы. Здаецца, ніхто асабліва не разлічваў на нашу дапамогу. Нас нават не пераадзелі ў квяцістыя халаты, як усіх іншых памагатых, у тым ліку мужчын. Пазбаўленыя дзелавых касцюмаў, мы выглядалі як лянівыя паніскі або гарадскія камбінатаркі. Здавалася, нас выправілі з хаты, каб мы там не перашкаджалі ў падрыхтоўцы да свята, якая ад рання да вечара ішла поўным ходам у хаце і на панадворку паэта.

— А чаму Анатоль пахаваны ў Гарошкаве? — спытала я.

— Як чаму? — здзівілася Валя.

Мне стала сорамна з-за самага дурнога і недарэчнага пытання, якое можна паставіць у Гарошкаве. Сам Анатоль пахаваў сябе тут у сваім творы, яшчэ далёка да сваёй фізічнай смерці:

Пад бярозаю косці,
а ў кароне гняздо
птушка мосціць,
тут вячыста
— надзіва — здаецца:
я сам тут ляжу —
на вясковым пагосце
збаўляюцца людзі ад злосці,
ён як гай запаветны,
здзіўляе спакоем душу.

Каб падняць свой настрой, я пачала думаць пра падарак пакойніку. Ніхто з абачлівых палешукоў, у тым ліку і Ганна Кандрацюк, не выправіцца з пустымі рукамі на сустрэчу з памерлымі. На спатканне з духам паэта я спецыяльна развучыла старажытную падляшскую песню са Збуча, які, так як і Гарошкаў, славіцца гарадзішчам мілаградска-зарубінецкай культуры. Мы ведалі, што Анатоль Сыс часта прыходзіў з сябрамі на могілкі, каб паспяваць для нябожчыкаў. Вядома, нам хацелася яшчэ старым дзядоўскім звычаем наліць яму чарку і запаліць вогнішча ля магілы.

* * *

Пра пахаванне Анатоля Сыса па сёння ў сталічным Мінску апавядаюць легенды. Першае месца належыць тут Адаму Глёбусу, які памясціў пасмяротныя гарачыя занатоўкі на сваім блогу. Аднапляменец Сяргей Сыс не горшы ад названага літаратара, хоць апошні ў адрозненні ад першага мае чым пахваліцца. У паэта новая жонка і дачушка...

У палове мая 2005 года, калі вынесуць цела Анатоля з яго хаты на гарошкаўскія могілкі, сарвецца вецер. Дарогу на могілкі (за два кіламетры) пераадолеюць па-сучаснаму, на машынах:

— Я прысеў на машыну побач яго труны, — успамінае Сяргей, — пільнаваў, каб вецер не сарваў бел-чырвона-белага сцяга, якім накрылі труну.

Адразу, пасля смерці, Анатоль яшчэ не карыстаўся такой папулярнасцю як сёння. У апошні шлях праводзілі толькі родныя, суседзі і жменька сяброў з Мінска і Гомеля. Больш за людзей пастаралася матка-прырода. Прыаздобленыя майскай зеленню бярозы зграбна схіляліся на ветры, быццам кланяліся новапрадстаўленаму пакойніку. Містэрыю папаўняў вясновы шчэбет жаўранкаў, ад якога аж вібравала паветра. Ніхто не прадбачыў, што лагодна-журботны настрой парушыць лямант. Жэст, дарэчы, упісаўся ў традыцыю надмагільных галашэнняў. У момант, калі намерыліся апускасць дамавіну ў дол, пачуўся жаночы плач:

— Яго там няма ўсярэдзіне! — загаласілі трывожна сёстры.

І, насуперак грамадзе, заўпарціліся, каб адкрыць труну.

Публіка ўскалыхнулася, людзі крычалі, адмаўлялі. Цела даставілі ў Гарошкаў ужо амаль два тыдні пасля смерці, у шчыльна завінчанай труне. Ды сама Валянціна не магла сумнявацца ў смерці Анатоля. Труп брата яна пабачыла ў яго мінскай кватэры, два дні пасля ягонай смерці. Раней яна была вымушана прыехаць з Брэста, каб у яе прысутнасці міліцыя зламала дзверы ў кватэру. Анатоль ляжаў мёртвы і ўжо пачарнелы ў калюжы крыві...

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Галіна Дубянецкая і Сяргей Сыс

Сам Сяргей не ведае чаму паддаўся настрою. Ці не вінаватая тут кроў? Калі прыгледзецца яго генеалагічнаму дрэву, Анатоль прыходзіўся яму дзядзькам у пятым пакаленні. Сяргей рад не рад стаў тады адкручваць залатыя вінты, корпацца пры засаўках, аж упацеў. Каб пасля ўміг ахалонуць і адубець ад убачанага з-за прыпаднятай накрыўкі.

— Цела ўжо пачарнела і абрасло белай шчацінай. Гэта быў страшны від, я аж пашкадаваў сам сябе. Ну, але я пазнаў яго. І сёстры пазналі. Гэта быў Анатоль.

Неўзабаве лёс узнагародзіць адважны ўчынак Сяргея. Апошняя інфармацыя не менш важная для нашай кнігі цудаў. Сорак дзён пасля смерці, на Анатолевых памінках, якія зладзяць сёстры ў святліцы ў роднай Сяргеевай Заспе, сустрэне сваю будучую жонку. Працудоўную паэтку Галіну Дубянецкую.

(працяг будзе)

17.01 — 23.01

(22.03. — 20.04.) 19-23.01. будзеш уніклівы, разбярэшся ў сітуацыі, усё разгрызеш. 20-24.01. не памылі кахання з сяброўствам (адна ноч можа мець вельмі непрыемныя вынікі!!!). 18.01. пачнецца для цябе асаблівы час; можаш адчуць моцную духовую апеку.

(21.04. — 21.05.) Шаленствы ў каханні. Можаш разлічваць на павышэнне. Пасля 18.01. вялікі рух у кампаніі; будзе гнаць цябе да файных людзей. Увесь месяц будуць турбаваць цябе змены ў хатнім жыцці (цяжка іх будзе поўнасцю зрэалізаваць). Старайся не прастыць.

(22.05. — 22.06.) Старайся не ацэньваць людзей і сітуацый, бо высновы могуць быць фальшывыя або павярхоўныя. У другой палове месяца пошукі новых уражанняў у каханні могуць завесці цябе ў тупік. Ахвота хуткага прыбытку можа ў будучыні прынесці нечаканыя клопаты.

(23.06. — 23.07.) Можаш разлічваць на паляпшэнне фінансавай сітуацыі. Паможа табе таксама партнёр, дзякуючы якому можаш радыкальна змяніцца. Можаш разлічваць таксама на блізкіх і знаёмых. Засумуеш па доме і блізкіх, калі ты ад іх далёка.

(24.07. — 23.08.) Дзякуючы неардынарным задумам можаш хутка ўзбагацець. Будзеш больш гнуткі і адкрыты на новыя прапановы. З 22.01. (да 26.01.) можаш асноўна перабудаваць свае адносіны з людзьмі; выкажашся спеласцю і адказнасцю. Не ператамляйся і дбай аб здароўе.

(24.08. — 23.09.) Да 19.01. маеш шанц паказацца і засяродзіць на сабе ўвагу. У час зацьмення Сонца будзь растаропным. Трымайся здалёк ад азарту! Шмат выдаткаў. Не замучвай сябе ўспамінамі крыўды, не злуйся. Варта камусьці дараваць віну, каб самому было лягчэй.

(24.09. — 23.10.) 20-24.01 — разумныя вырашэнні фінансавых і сямейных праблем. Будзеш самаўпэўнены і адважны. Прафесійныя справы паскорацца. У час абручовага зацьмення Соцна — непасляроўнасць, трывога, недахоп цярплівасці, могуць папсавацца адносіны з начальствам; на шчасце дойдзеце да ладоў.

(24.10. — 22.11.) Дасканалыя адносіны з партнёрам. Дагаворышся з кіраўніцтвам і супрацоўнікамі. Парадак у пачуццёвым жыцці пазітыўна адаб'ецца на іншых сферах. Самотны Скарпіён наладзіць цікавае знаёмства, якое можа змяніцца ў каханне. 20-24.01. шануй сваіх працаўнікаў, і не правакуй іх, бо будзеш пад уплывам апазіцыі Марса з Ліліт.

(23.11. — 22.12.) З 18.01. пачынаецца твой проста неверагодна дынамічны час, поўны нечаканых паваротаў, незвычайных падзей, колеру. Адкрыешся на невядомае, рызыкнеш. 20-24.01. знакаміты час на экзамены, лагоджанне далікатных сямейных спраў. 16-20.01. трымайся фактаў, а не мутных прадчуванняў (не ўлазь у абяцанні, не будзь некрытычным).

(23.12. — 20.01.) Будзь асцярожны з афармленнем ключавых спраў. Не прадбачваюцца ані вялікія поспехі, ані лады ў каханні. Не апускай рук! Найлепшыя даты на рэалізацыю розных планаў — з 20.01. (аж да 26.01.); трэба будзе выправіць штосьці, абдумаць, змяніць напрамак, стратэгію, дапрацаваць дэталі.

(21.01. — 19.02.) Добрая забава, чэрпанне прыбыткаў з ранейшых задум. Шчасце ў каханні; дыхнеш на поўныя грудзі. Гвалтоўныя любоўныя захапленні, жарснасць...

(20.02. — 21.03.) Шчасце, вера ў сябе, жыццярадаснасць. Свет проста цудоўны! З 18.01. пачынаецца твой незвычайна паспяховы год. Ды 20-24.01. пільна сачы, каб цябе не абдулі (гэта наконт прапановы з пачатку года).

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960